Расія павялічвае авіяцыйныя і чыгуначныя зносіны з Беларуссю. Рашэнне аб гэтым было прынята 31 мая аператыўным штабам па папярэджанні завозу і распаўсюджвання новай каранавірусной інфекцыі на тэрыторыі Расіі.

«Прынята рашэнне аб павелічэнні з 10 чэрвеня колькасці авіярэйсаў з Беларуссю па маршруце Масква — Мінск да дзесяці разоў на тыдзень на ўзаемнай аснове», — гаворыцца ў распаўсюджаным паведамленні аператыўнага штаба.

Таксама з 10 чэрвеня будуць адноўлены чыгуначныя зносіны паміж Беларуссю і Расіяй па маршрутах Гомель — Масква і Полацк — Масква на штодзённай аснове. Акрамя таго, павялічыцца колькасць вагонаў у цягніках «Ластаўка» па маршруце Масква — Мінск. Іх пусцілі паміж дзвюма сталіцамі 30 красавіка. Час у дарозе займае менш за сем гадзін.

У абарачэнне прызначаны дзве пары новых хуткасных міжнародных цягнікоў № 717/722 і № 721/718 Масква — Мінск — Масква фарміравання расійскага боку. Гэтыя цягнікі курсіруюць штодня і адпраўляюцца з пачатковых і прыбываюць у канчатковыя пункты прызначэння па люстэркавым раскладзе двойчы ў дзень.

Цягнікі № 722/717 з Мінска і Масквы адпраўляюцца ў 6.20 і прыбываюць у Маскву і Мінск у 13.10. У дарозе яны робяць прыпынкі ў Оршы і Смаленску.

Цягнікі № 718/721 з Мінска і Масквы адпраўляюцца ў 16.00 і прыбываюць на канчатковыя пункты прызначэння ў 22.55. У дарозе робяць прыпынкі ў Оршы, Смаленску і Вязьме.

Беларуская чыгунка звяртае ўвагу, што ажыццяўленне праезду названымі цягнікамі прадугледжана толькі для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

«Белавія» запусціла рэгулярныя рэйсы ва Уфу. Раней авіяперавозчык адкрыў такія напрамкі, як Екацярынбург і Самара. Уфа стала дзявятым рэгулярным маршрутам у Расію, даступным пасажырам у цяперашні момант, гаворыцца на сайце «Белавія».

Па маршруце Мінск — Самара — Мінск авіякампанія пачала выконваць рэйсы з 5 мая. Палёты адбываюцца па серадах з вылетам з Мінска ў 0.15 і прыбыццём у Міжнародны аэрапорт Самары «Курумоч» у 3.25. Зваротныя рэйсы ў сталіцу Беларусі ажыццяўляюцца ў гэты ж дзень у 4.25 з прылётам у Нацыянальны аэрапорт Мінск у 5.55. Час для ўсіх аэрапортаў названы мясцовы. Пералёт у адзін бок зойме крыху больш за дзве гадзіны, паведамляе авіякампанія.

Палёты «Белавіі» ў Екацярынбург пачаліся з 7 мая па пятніцах з вылетам з Мінска ў 23.10 і прыбыццём у 4.10 у Міжнародны аэрапорт «Кальцова». Зваротны рэйс — па суботах з вылетам у 5.10 і прыбыццём у Нацыянальны аэрапорт Мінск у 6.25. Час для ўсіх аэрапортаў названы мясцовы. Пералёт у адзін бок зойме каля трох гадзін.

Мінімальная цана квіткоў па тарыфе LIGHT для Самары складае 84 еўра ў адзін бок і 163 еўра туды-назад. Для Екацярынбурга: у адзін бок — 143 еўра, у абодва бакі — 233 еўра.

Рэйсы Мінск — Уфа — Мінск будуць выконвацца адзін раз на тыдзень — па панядзелках. Вылет з Нацыянальнага аэрапорта Мінск у 0.10, прыбыццё ў Міжнародны аэрапорт «Уфа» — у 4.55. Зваротны рэйс з Уфы плануецца ў 6.20 з прылётам у Мінск у 7.05. Час для ўсіх аэрапортаў названы мясцовы.

У адзін бок дарога зойме 2 гадзіны 45 хвілін. Кошт аднаго білета стартуе ад 98 еўра па мінімальным тарыфе без багажу (LIGHT), у абодва бакі — ад 183 еўра.

«Мы рады, што аэрапорт «Уфа» стане адным з ключавых авіяцыйных вузлоў, якія забяспечваюць прамыя паветраныя зносіны паміж Расіяй і Беларуссю, — сказаў камерцыйны дырэктар Дзяніс Нікіцін. — Адкрыццё рэйса з Уфы ў Мінск будзе спрыяць развіццю партнёрства паміж краінамі ЕАЭС і ўмацаванню дзелавых сувязяў. Упэўненыя, што новы напрамак дапаможа развіццю не толькі бізнесу, але і турызму».

На нядаўняй нарадзе Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сказаў, што міністэрствамі транспарту Беларусі і Расіі абмяркоўваюцца іншыя напрамкі палётаў самалётаў «Белавіі». Таксама кіраўнік дзяржавы паабяцаў кампанію падтрымку.

«А што «Белавія»? Не дачакаецеся! Мы не скароцім персанал на 50 працэнтаў, як вы хацелі б. Мы прарвёмся! «Васількі» застануцца ў небе, мы будзем лятаць!» — напісаў у сацыяльных сетках генеральны дырэктар «Белавіі» Ігар Чаргінец у адказ на закрыццё павет-ранай прасторы еўрапейскіх краін для самалётаў кампаніі.

...Заканчваючы тэму аднаўлення транспартных зносін паміж дзвюма краінамі, застаецца дадаць колькі слоў пра аўтобусныя маршруты. Так, адновяцца аўтобусныя рэйсы ў два расійскія гарады: у чэрвені «Мінсктранс» пачне выконваць іх у Маскву і Санкт-Пецярбург. Аўтобусы пачнуць хадзіць з Мінска 4 чэрвеня.

Так, рэйс Мінск — Санкт-Пецярбург будзе выконвацца праз дзень адпраўленнем з беларускай сталіцы ў 19.00, назад — у той жа час наступных сутак.

Рэйс Мінск — Масква ўстаноўлены па такім жа графіку, але з іншым часам выезду: з Мінска — у 20.30, з расійскай сталіцы — у 19.00 (аўтавакзал «Паўднёвыя вароты») і ў 20.45 (аўтавакзал «Салар'ева»).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Блізкая ўлада

ПЫТАННІ ВЫРАШЫЛІСЯ ДА ПРЫЁМУ

З тых людзей, якія запісаліся ўчора на асабісты прыём грамадзян да старшыні Магілёўскага аблвыканкама Леаніда ЗАЙЦА, была жыхарка Крычаўскага раёна. Яна прыехала не паскардзіцца, а падзякаваць за вырашэнне жыццёва важнага для яе пытання. Раней жанчына ўжо звярталася на прыём і яе праблема была разгледжана. Цікава, што адразу некалькі заяўнікаў яшчэ да прыёму ў губернатара атрымалі станоўчыя адказы, і неабходнасць у сустрэчы адпала.

— Адна заяўніца, напрыклад, скардзілася на высокую арэндную плату за аўтастаянку, але ў апошні момант паведаміла, што пытанне вырашаецца, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама Генадзь АЛЕЙНІКАЎ.** — Запісваўся таксама прадстаўнік бізнесу, у якога ўзніклі цяжкасці з выплатамі падаткаў і выплатамі за арэнду. Аднак пасля ўмяшання кіраўніка вобласці ўсе праблемы былі вырашаны.

Яшчэ адна заяўніца звярнулася з просьбай аказаць матэрыяльную дапамогу ў сувязі з цяжкім фінансавым становішчам. Ёй таксама дапамаглі.

Былі і такія, хто прыйшоў на прыём, каб падзякаваць за ўжо аказаную дапамогу. Напрыклад, жыхарка Бабруйска, якая ў 2020 годзе звяртал

Весткі з Кітая

МІНСК НАБЛІЗІЎСЯ ДА ШАНХАЯ

На форуме ШАС падпісана пагадненне паміж раёнамі гарадоў

Форум народнай дыпламатыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) праходзіць у горадзе Ухань, што ў правінцыі Хубэй (цэнтральны Кітай). Ён прымеркаваны да святкавання 20-й гадавіны з дня ўтварэння ШАС.

Форум праводзіцца ў змешаных фарматах «анлайн + афлайн». У ім удзельнічаюць сотні кітайскіх і замежных гасцей, сярод якіх дыпламаты, прадстаўнікі бізнесу, эксперты аналітычных цэнтраў, універсітэтаў і навукова-даследчых інстытутаў з дзяржаў-членаў, краін-назіральнікаў і партнёраў па дыялогу ШАС. Карэспандэнт «Звязды» таксама бярэ ўдзел у маштабным мерапрыемстве.

Учора прайшоў шэраг пленарных сесій. Іх удзельнікі разгледзелі актуальныя пытанні глабальнага ўзаемадзеяння ў рамках ШАС, развіцця «мазгавых цэнтраў», гарадоў-пабрацімаў, сістэмы аховы здароўя ва ўмовах сённяшніх глабальных выклікаў (сярод якіх — пандэмія каранавіруса), а таксама вынікі развіцця вёскі і выкаранення беднасці ў Кітаі.

Паводле інфармацыі **старшыні Кітайскай народнай асацыяцыі сяброўства з замежнымі краінамі Лінь СУНЦЯНЯ,** у гарадоў Паднябеснай заключаны больш чым 2,8 тысячы дагавораў з пабрацімамі звыш 130 краін пяці кантынентаў. Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва ў гэтым плане — надзейная платформа для ўзаемадзеяння. Як лічыць **намеснік генеральнага сакратара ШАС Чжан ХАЙЧЖОЎ,** сярод галоўных задач — падтрыманне рэгіянальнай бяпекі і садзейнічанне агульнаму развіццю.

Уханьскі форум ужо мае канкрэтныя вынікі. У прыватнасці, на палях мерапрыемства быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Савецкім раёнам беларускай сталіцы і раёнам Чанін Шанхая. Як адзначыў **кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска Сяргей ХІЛЬМАН,** кантакты паміж тэрыторыямі развіваюцца ўжо з 1990-х, і сёння здзейснены заўважны крок наперад, які дазволіць актывізаваць узаемадзеянне па шэрагу важных напрамкаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

«Вытокі» пачынаюцца ў Оршы

Чаму варта ўзяць курс на Віцебшчыну

Спартыўна-культурны фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» працягвае турнэ па краіне. З 3 да 5 чэрвеня ён уладарыць у Віцебскай вобласці. Майстар-класы, круглыя сталы, вакальныя конкурсы і спартыўныя спаборніцтвы — лета ў Оршы пачынаецца ярка.

ЗАНЯТКІ ДАСПАДОБЫ ЗНОЙДЗЕ КОЖНЫ

Першыя дні фестывалю, 3 і 4 чэрвеня, будуць прысвечаны культурна-гістарычнай спадчыне рэгіёна. У чацвер у Аршанскім езуіцкім калегіуме пройдзе круглы стол «Орша: традыцыі ў сучаснасці», пачнуць працаваць выстаўкі «Кола часу» і дзіцячых малюнкаў. У дзіцячай школе мастацтваў кіраўнік арт-групы «Беларусы», спявак і кампазітар Валерый Шмат правядзе творчую сустрэчу «Мой крок да Алімпу», там жа адбудзецца і канцэрт арганнай музыкі. На пятніцу запланаваныя адукацыйныя семінары для аўтараў маладзёжных творчых і інавацыйных праектаў, а таксама прадстаўнікоў прадпрыемстваў рэгіёнаў, дзе абмяркуюць распрацоўку і развіццё рэгіянальнага брэнда.

А ў суботу, 5 чэрвеня, Орша стане спартыўным цэнтрам краіны. Удзельнікі паспрабуюць свае сілы ў алімпійскім квэсце. Правілы простыя — выконваеш 15 заданняў па розных відах спорту і атрымліваеш прызы ад арганізатараў. Майстар-класы «алімпійцам-пачаткоўцам» дадуць вопытныя спартсмены — біятланістка Людміла Калінчык і барэц грэка-рымскага стылю Ігар Каныгін. Дарэчы, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў і двухразовы чэмпіён свету Ігар Каныгін — ураджэнец Віцебшчыны.

РАДЗІМА МОЦНЫХ ЛЮДЗЕЙ

Наведаць «Вытокі» ў Оршы будзе цікава і тым, хто не лічыць сябе вялікім аматарам спорту, але хоча лепш пазнаёміцца з Беларуссю. У гісторыі горада багата адметных падзей і знакамітых выхадцаў. Падчас адступлення французскай арміі ў 1812 годзе тут пабываў сам Напалеон, а таксама вядомы французскі пісьменнік Стэндаль. Пасля, праўда, горад быў падпалены. Але яго аднаўленне — таксама важная частка гісторыі. Орша займае пачэснае месца ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта тут у 1941 годзе ўпершыню ў баі была задзейнічана легендарная рэактыўная сістэма залпавага агню «Кацюша». Падчас ваеннага ліхалецця Орша была адным з цэнтраў падпольнай дзейнасці. Адну з груп, якая дзейнічала непасрэдна на чыгуначным вузле, узначальваў Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў. Орша — горад, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені за мужнасць і стойкасць, праяўленыя падчас вайны 1941—1945 гадоў.

Славіцца Орша і сваімі ўраджэнцамі. Бадай ці не самы вядомы з іх — пісьменнік Уладзімір Караткевіч, у Оршы і сёння дзейнічае яго музей. Сёння сваю малую радзіму праслаўляе **Аляксей ТАЛАЙ, спартсмен-параалімпіец, матывацыйны спікер, бізнесмен, член Канстытуцыйнай камісіі, рэкардсмен свету па плаванні, прызёр чэмпіянату Еўропы.**

«Мой родны горад — важнае, дарагое месца для маёй душы, для майго сэрца. Вельмі сумую, калі доўга не атрымліваецца прыехаць. І з радасцю лячу туды, як толькі з'яўляецца магчымасць наведаць гэтыя мясціны, гэтыя вулачкі. Вельмі добрыя ўспаміны — першыя сустрэчы, першае каханне, дзеці. Там я пераразараджаюся, атрымліваю зарад пазітыву. Гэта святое для мяне месца, пупавіна. Чым бліжэй да таго месца, дзе з'явіўся на свет, тым больш сіл дае гэтая крыніца. Калі я быў далёка за мяжой, за акіянам, выразна адчуваў тугу па роднай зямлі», — дзеліцца Аляксей Талай.

Галоўным багаццем Оршы Аляксей называе людзей. Аршанцы актыўна яго падтрымліваюць, радуюцца поспехам, пішуць каментары, рэпосцяць інфармацыю пра спартыўныя перамогі і праекты. «У Оршы шмат добрых людзей, для якіх сэнс жыцця — дзеці. Выхаваць з хлапчука сапраўднага мужчыну, убачыць у ім патэнцыял, развіць мужчынскія адносіны да жыцця, да жанчыны, мамы, сястры. І яны могуць зацікавіць спортам, фізічнай культурай. Орша ў гэтым плане змянілася, горад стаў вельмі прыгожы, вакол яго ствараецца важная інфраструктура. Я ўпэўнены, што ў майго роднага горада светлая будучыня, перспектывы ўжо праглядаюцца. Маладыя людзі разумеюць гэта, укараняюцца ў горадзе, нараджаюць дзяцей і не збіраюцца нікуды з'язджаць», — адзначае Аляксей.

Ён расказаў, што менавіта трэба ўбачыць гасцям горада, якія прыедуць у гэтыя выхадныя на аршанскія «Вытокі». У турыстычную праграму варта ўключыць дзіцячы парк на беразе Дняпра, намаляваныя старыя храмы, музеі Караткевіча і Заслонава, этнаграфічны музей «Млын» (які размяшчаецца ў млынавым комплексе). Аляксей Талай раіць паглядзець на старажытнае гарадзішча, якое з усіх бакоў акружана рэкамі Аршыца (ад якой і пайшла назва горада) і Дняпро. Таксама Аляксей прапаноўвае праехаць па адрэстаўраваным мосце над Дняпром і адчуць моц гэтай ракі і прыгажосць горада. І, вядома, наведаць помнікі героям Вялікай Айчыннай вайны, курган Славы, дзе гарыць Вечны агонь. «Вакол кургана — парк, дзе шмат маладых дрэў. У 2000 годзе ў Оршы быў моцны ўраган, і шмат дрэў паваліла. Таму цяпер там растуць маладыя бярозы, хвоі, мае любімыя вербы, там вельмі прыгожа. Там паставілі тэхніку, і дзеці вельмі любяць яе. У горадзе ёсць што паглядзець», — запэўнівае Аляксей Талай і падкрэслівае, што гасцям «Вытокаў» у Оршы сумна не будзе.

Валерыя СЦЯЦКО.

«БАЗАР» НАВАТ СТАНЦУЮЦЬ

Да пачатку самага маштабнага на постсавецкай прасторы фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» застаецца паўтара месяца. Прадстаўнікі больш як трыццаці краін возьмуць у ім удзел.

Навіны агучылі віцебскім журналістам у першы летні дзень. Дарэчы, як і летась, прэс-канферэнцыя адбылася на сцэне Летняга амфітэатра — галоўнай сцэнічнай пляцоўкі «базару». Культурны праект сёлета пройдзе трыццаты раз (з 14 да 19 ліпеня).

Наконт адмены ўдзелу некаторых артыстаў **кіраўнік дырэкцыі «базару» Глеб ЛАПІЦКІ** лічыць, што гэта права тых, хто адмовіўся... Такое было і раней шмат разоў па розных прычынах, адзначыў ён. Самая аператыўная інфармацыя — на сайце фестывалю, і толькі там трэба сачыць за зменамі ў праграме.

Па-ранейшаму сярод галоўных падзей — конкурсы маленькіх і маладых выканаўцаў. Усяго іх больш за трыццаць.

Пётр ПАДГУРСКІ, начальнік упраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, падкрэсліў, што сталіца Падзвіння зноў з гонарам прыме ўдзельнікаў і гасцей. І цяжка падзяліць падзеі на асноўныя і спадарожныя. Усё будзе цікава, бо ў праграме — канцэрты, выставы, паказы і іншае для людзей розных інтарэсаў і ўзростаў. Робіцца многае, каб у Віцебск прыехала больш майстроў народных рамёстваў, самадзейных калектываў. Беларусь пакажа «вясёлку» свайго культурнага багацця, і традыцыйнае мастацтва будзе побач з сучасным, падкрэсліў ён.

Віктар ГЛУШЫН, намеснік старшыні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта, нагадаў, што рыхтавацца да будучага «базару» традыцыйна пачынаюць адразу пасля заканчэння чарговага. Як заўсёды, генеральнай рэпетыцыяй стане свята горада. Сёлета яно адбудзецца 26 і 27 чэрвеня.

Дарэчы, гэтай вясной у Віцебску высадзілі шмат цюльпанаў. Сэлфі і здымкі на фоне гэтай прыгажосці ўжо папаўняюць архівы аматараў рабіць летапіс свайго жыцця пры дапамозе смартфонаў. Вядома, і ў Дзень горада, і падчас фестывалю будзе багаты вулічны гандаль з падворкамі, лакацыямі для кухараў, рамеснікаў, народных талентаў, якія прадстаўляюць культуры раёнаў Віцебшчыны.

Кацярына ЛАБУКА, дырэктар Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, расказала, што, як і ў мінулыя гады, на вуліцах і плошчах можна будзе паназіраць за мастацтвам мажарэтак і барабаншчыц з розных краін.

Адбудзецца конкурс традыцыйнага бытавога танца «Танчым разам». Аказваецца, ёсць і танец «базар», што вельмі сімвалічна. У вялікім карагодзе, змейкай танцоры ў нацыянальных касцюмах пройдуцца па цэнтральных вуліцах Віцебска. Сёлета агульная колькасць удзельнікаў праекта — каля пяцісот.

Парадуе праект «Віват, аркестр!», які правядуць на плошчы Свабоды. Будзе цікавым зводны нумар з фанфарамі з удзелам музыкантаў духавых аркестраў. Упершыню правядуць конкурс «Спяём з аркестрам».

Вельмі чакаюць на «базары» конкурс цацкі «Забава». Яго арганізуюць на адной з пешаходных вуліц і ў дворыку каля ратушы. Можна будзе купіць цацкі, паназіраць за тым, як майстры іх робяць.

Праект «Лялечны квартал» стане «каралеўствам» для дзяцей. Але будуць спектаклі і для дарослых. Сёлета «квартал» правядуць восьмы раз. У Віцебск прыедуць артысты з Расіі, Украіны. Упершыню пакажуць свае спектаклі артысты з Арэнбурга і Пскова. Па традыцыі будуць і бясплатныя выступленні лялечнікаў на вуліцы.

Таццяна СТАРЫНСКАЯ, дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, паведаміла, што падчас фестывалю музеі будуць закрывацца на некалькі гадзін пазней.

Упершыню ў Віцебску пройдзе нацыянальная філатэлісцкая выстава, дзе можна будзе ўбачыць творы з васьмідзесяці калекцый розных краін. Маркі прадэманструюць у будынку ратушы.

Адбудзецца цікавая выстава з прыватнай калекцыі, прысвечаная культуры і традыцыі каракаў. Экспанаты яе зроблены з біўняў маржа, рыбнай лускі, рагоў аленя. Народны ансамбль выканае традыцыйныя карацкія песні.

У рамках правядзення традыцыйнага праекта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў Віцебску прадставяць хахламу. Некаторыя экспанаты можна будзе купіць. А яшчэ будуць паказаныя творы майстрых залатога шыцця з Таржка.

Дырэкцыя заўважыла, што шмат ахвотных стаць як валанцёрамі, так і ўзяць удзел у VII Фэсце вулічнага мастацтва «На сямі вятрах».

З'явіцца магчымасць убачыць бокс на рынгу, які размесціць на пляцоўцы каля Летняга амфітэатра. На сёння вядома, што сярод удзельнікаў будуць і баксёры з далёкага Пакістана.

Як і ў мінулыя гады, адбудзецца тэатральная праграма: чатыры спектаклі пакажуць на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.

А ў Віцебскай абласной філармоніі будзе гучаць джаз.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

О У тэму

НА КАНЦЭРТЫ — ЦЯГНІКОМ

Беларуская чыгунка на час правядзення XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» прызначыла цягнік міжрэгіянальных ліній № 644/643 Мінск — Віцебск — Мінск.

Расклад яго руху складзены з улікам праграмы правядзення фестывалю. Ён будзе курсіраваць штодня з Мінска з 14 да 19 ліпеня, а з Віцебска — з 15 да 20 ліпеня.

Са станцыі «Мінск-Пасажырскі» цягнік адправіцца ў 12.28 і прыбудзе ў Віцебск у 16.05.

Пасля завяршэння канцэртнай праграмы госці «Славянскага базару» на гэтым жа цягніку змогуць вярнуцца ў Мінск. З Віцебска ён будзе адпраўляцца ноччу ў 1.30 і прыбываць у сталіцу раніцай у 5.44.

Продаж праязных дакументаў ужо адкрыты. У прэс-цэнтры магістралі адзначылі, што цягнік на «Славянскі базар» карыстаецца асаблівай папулярнасцю ў жыхароў і гасцей нашай краіны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБСАЛЮТНЫ РЭКАРДСМЕН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наўрад ці сярод нашых чытачоў шмат тых, хто выпісвае «Звязду» з чэрвеня 1955 года. Даўняе сяброўства з газетай у яго пачалося на Мінскім трактарным заводзе, куды пасля службы ў войску Анастас Семяновіч прыйшоў працаваць электрыкам.

— Як сёння памятаю, калі мне прапанавалі выпісаць якую-небудзь газету, — успамінае Анастас Лявонцевіч. — Выбар тады быў вялікі. Я ж вырашыў, што выпішу толькі «Звязду». І ніколі з таго часу не здраджваў роднай газеце. Мову люблю з дзяцінства. На ёй заўсёды размаўляю, ды і чытаць люблю толькі па-беларуску.

ПАДМАНУЎ, КАБ ТРАПІЦЬ У ВОЙСКА

Анастас Семяновіч нарадзіўся пад Слуцкам. У вёсцы Сахалін і прайшло ўсё яго дзяцінства.

— Вёску з двух бакоў атачала рака Случ, — тлумачыць наш чытач паходжанне назвы. — Вясной, падчас разводдзя, вада выходзіла з берагоў і падступала да самых хат. Жылі як на востраве.

Ён з'явіўся на свет у сям'і звычайных сялян, у якой выхоўвалася шасцёра дзяцей. Галеча, нястача. Таму каб аблегчыць жыццё сваім родным, хлопец вырашыў раней за тэрмін пайсці ў армію. Калі яго спыталі, колькі класаў скончыў, сказаў, што восем. Насамрэч, за плячыма ў Анастаса Семяновіча была толькі сямігодка — каб пайсці на службу, прыйшлося прыпісаць сабе год. Спачатку накіравалі ў лётную часць, у Баранавічы. Пасля даслужваў у групе савецкіх войскаў у Германіі, дзе абслугоўваў ваенныя самалёты. Анастас Лявонцевіч згадвае, які зруйнаваны пасля Вялікай Айчыннай вайны быў Дрэздэн, немцы яго адбудоўвалі нанава.

АЎТАР НАЗВАЎ І ДОБРЫ ГАСПАДАР

У 1955 годзе старшы сяржант Анастас Семяновіч дэмабілізаваўся. У ваенкамаце яму прапанавалі працягваць службу, але ён не захацеў: хапіла армейскага жыцця. Пайшоў на трактарны завод, паралельна заканчваў 8-мы, 9-ты і 10-ты класы, вучыўся ва ўніверсітэце.

За плячыма Анастаса Семяновіча — два інстытуты: політэхнічны (цяперашні БНТУ) і інстытут Губкіна (сёння — Расійскі дзяржаўны ўніверсітэт нафты і газу імя Губкіна), які скончыў з адзнакай. У Германіі вучыўся ў Вышэйшай партыйнай школе. Амаль 40 гадоў Анастас Лявонцевіч адпрацаваў у «Белтрансгазе» галоўным спецыялістам Дзяржгазнагляда СССР, стаў заслужаным работнікам Мінгазпрама СССР. Красамоўны факт: менавіта па яго ініцыятыве «Захадтрансгаз», як раней называлася прадпрыемства, стаў «Белтрансгазам».

Прыдумаў Анастас Лявонцевіч і назву вуліцы, на якой жыве ў пасёлку Лясны Бараўлянскага сельскага Савета. Гэта цяпер Бярозавы гай — адна з асноўных вуліц населенага пункта. Калі ж будаваўся наш падпісчык, тут было ўсяго некалькі хат.

Праўда, адраса яны некаторы час не мелі. «А як гэта, каб вуліца была безназоўная? — задаўся пытаннем наш чытач і пайшоў у адміністрацыю. — Ці то жартам, ці то не, мяне папрасілі прапанаваць варыянты назваў. Я і кажу — Бярозавы гай. Пытаюцца: чаму? Кажу ім: ідзіце да мяне на падворак і паглядзіце, што ўвесь агарод у бярозах».

У сельскім Савеце назву адобрылі. Сёння, праўда, бяроз ужо не так шмат: дрэвы выцеснілі новыя асабнякі. Але ў Анастаса Лявонцевіча некалькі бяроз захавалася. Яны займаюць пачэснае месца побач з туямі і яблынямі. Увогуле, на ўчастку ў Анастаса Семяновіча — дагледжаны агарод, цяпліца, вялікая колькасць самых розных кветак — дзякуючы ўмелым рукам нявесткі яны квітнеюць ад ранняй вясны да позняй восені. Наш чытач таксама без справы не

сядзіць: і градку ўскапаць можа, і лазню натапіць (і гэта ў 89 гадоў!), а таксама ён косіць траву — сучаснай касілкай, вядома, але тым не менш. Яшчэ нядаўна трымаў якую-ніякую гаспадарку, сёння ж ужо можа спраўляцца толькі з курамі.

ПАДАРУНКІ АД ЦАРА І МАРШАЛА

Мы сядзім на падворку ў Анастаса Семяновіча, любуемся прыродай. Раптам ён згадвае свайго бацьку. Аказваецца, селянін з-пад Слуцка ахоўваў Мікалая II. Падчас рэвалюцыі многіх сваіх людзей цар адпусціў, перад гэтым шчодра ўзнагародзіўшы за верную службу. Гаршчочак з манетамі, а былі там і залатыя, закапалі ў садзе. Калі той спатрэбіўся, знайсці скарб, падараны Мікалаем II, не атрымалася.

Яшчэ адзін красамоўны факт: бацьку нашага героя сам Жукаў зрабіў падарунак. Толькі маршалам Георгій Канстанцінавіч тады яшчэ не быў. Да вайны будучы палкавадзец служыў у Слуцку — камандаваў 4-й кавалерыйскай дывізіяй імя Варашылава. Старэйшы Семяновіч быў у яго забеспячэнцам. За добрую службу Жукаў аддаў яму свайго сабаку, які шмат гадоў верна служыў новаму гаспадару.

— У гады Вялікай Айчыннай вайны немцы тройчы забіралі Грэкса (нямецкую аўчарку, падараную маршалам. — **Аўт.**), — расказвае Анастас Лявонцевіч. — І тройчы давалі за яго паўмяшка солі. Але жывёліну не падманеш: сабака ўсё роўна вяртаўся дамоў.

У канцы нашай размовы пытаюся ў гаспадара, адкуль у яго такое незвычайнае імя.

— Калі ў 1944 годзе пайшоў у сельскі Савет па пасведчанне аб нараджэнні, у графе «імя» мяне запісалі як Анастасія, — кажа суразмоўнік. — Відаць, пераблыталі: так звалі маю сястру. У той час моцна не думалі. Замест таго, каб перарабіць дакумент, перапісалі апошнюю літару. Сказалі, Анастасіем буду. Так у мяне з'явілася новае імя. Хоць дагэтуль звалі мяне ўсе Станіславам.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Пасёлак Лясны.
Больш фота — на zviazda.by

Дзень падпісчыка

ДЗЯКУЙ ГАЗЕЦЕ ЗА РОДНУЮ МОВУ!

НА МІЖНАРОДНЫ ДЗІЦЯЧЫ ФЕСТЫВАЛЬ «ЗАЛАТАЯ ПЧОЛКА» Ў КЛІМАВІЧЫ ПРЫЕХАЛІ І ПАСТАЯННЫЯ ЧЫТАЧЫ «ЗВЯЗДЫ»

У перадапошнія дні мая ў Клімавічах было як у вялікім горадзе — шмат людзей, гандлёвых палатак, выставачных экспазіцый пад адкрытым небам. На фестываль прыехалі дэлегацыі з Расіі, Арменіі, Узбекістана, Кыргызстана, Малдовы, Сербіі. Адных толькі юных удзельнікаў было больш чым 400 чалавек.

У парку свае найлепшыя дасягненні ў мастацтве, рамесніцтве, народнай гаспадарцы дэманстравалі прадстаўнікі розных раёнаў Магілёўскай вобласці. Нехта прывёз свае вырабы, нехта — выстаўку або, напрыклад, казку. Імжыў дождж, але настрой у людзей быў бадзёры і прыўзняты. «Звязда» таксама ў баку не засталася, прыехала на свята з падарункамі і разам з клімавіцкім участкам паштовай сувязі арганізавала на фестывальнай пешаходцы Дзень падпісчыка. І хутка да нас завіталі адна з самых адданых чытачак «Звязды» **Таццяна ГРЫШАЕВА** разам з сынам Жэнем.

— Вельмі люблю газету, бо яна на беларускай мове — нашай родненькай, — прызналася яна. — Нават удзельнічала ў конкурсе падпісчыкаў і выйграла прас. Дагэтуль ім карыстаюся. Вельмі люблю блог Алены Ляўковіч, яна заўсёды ўздымае важныя тэмы. А мой сын ціка-

Таццяна ГРЫШАЕВА — адзін з актыўных чытачоў «Звязды».

віцца здымкамі Анатоля Клешчука. Для нас гэта эталон у фотасправе. А яшчэ шмат чаго цікавага даведваюся пра падарожжы, бо люблю вандраваць. Здаецца, шмат што ведаю пра родны край, а вось заўсёды знаходжу ў газеце нешта новае. Бяру на заметку ўсё, што збіраюся паглядзець гэтым летам.

На жаль, сёння такіх адданых чытачоў, як Таццяна, не вельмі шмат. Да нашай паштовай палаткі часцей падыходзілі, каб купіць марожанага. З цікавасцю глядзелі на чырвоныя «звяздоўскія» блакноты з душэўным надпісам «Да чытача — з любоўю» і пыталіся: «А колькі каштуе?» І ўздыхалі, калі чулі, што трэба спачатку падпісацца. Нататнік — гэта ж усяго толькі наш прэзент чытачу.

— Вось раней падпіска была вялікая, не трэба было нікога заклікаць, — спачувала **Ірына ЗАЙЦАВА, прадавец трэцяга гарадскога аддзялення клімавіцкага ўчастка паштовай сувязі.** У гэтай сістэме яна адпрацавала, лічы, усё жыццё і ведае іншыя прыклады, калі машыны прывозілі на пошту з друкарні цэлыя горы газет і часопісаў, а паштальёны, нагрузіўшы імі свае сумкі, ішлі па адрасах. Тады, напэўна, не было чалавека, які б не чытаў перыёдыку. Нават дзеці. На вачах Ірыны адбываліся ўсе тыя гістарычныя перамены, калі вузкі спецыфічны асартымент пошты — газеты, часопісы, пасылкі, лісты — пашырыўся да неабсяжных памераў. Цяпер пошта гандлюе ўсім, пачынаючы ад прадуктаў, заканчваючы дыванамі і бытавой тэхнікай.

Усцешыла, што на гэтым фоне «Звязду» ўсё роўна купляюць. Ёсць нават пастаянныя пакупнікі. Суразмоўніца згадала мясцовага ўрача-інфекцыяніста, які і ў звычайным жыцці карыстаецца роднай мовай.

На экспазіцыйных сцежках «Залатой пчолкі» сустрэлася і з нашымі прыхільнікамі з Мсціслава. **Мікалай Віктаравіч ФЕДАНЕНКАЎ, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Мсціслаўскага дзяржаўнага будаўнічага прафесійна-тэхнічнага каледжа,** адзін з іх. Лічыць, што ў каледжа шмат чаго агульнага са «Звяздой». Газета піша пра захаванне народнай спадчыны, культуру і традыцыі беларусаў. А ў каледжы ёсць вялікі музей «Спадчына» з чатырма экспазіцыйнымі залами. «Звязда» пра яго, дарэчы, пісала ў праекце «Вандроўка патрыёта». Мікалай Віктаравіч прызнаўся, што ўстанова пастаянна выпісвае больш за дзесяць асобнікаў газеты.

— А мая жонка Ірына Рыгораўна, настаўніца Мушынскай сельскай школы, наогул пастаянная падпісчыца «Звязды», — удакладняе ён. — Ёй падабаецца, што газета беларускамоўная, яна ў першую чаргу праглядае матэрыялы пра адукацыю. А я больш цікаўлюся гісторыяй. Хоць выданне шматграннае, інфармацыі там на любы густ. На жаль, не заўсёды хапае часу ўсё прачытаць. Але праглядаем газету ад вокладкі да вокладкі.

У Клімавіцкім раёне некалькі дзясяткаў пастаянных чытачоў «Звязды», і сярод іх шмат хто выпісвае выданне гадамі. Як вядомы **фальклярыст, казачнік і краязнавец з вёскі Судзілы Аляксандр ГАЛКОЎСКІ.**

— Гэта, лічы, надзейныя сябры выдання, не здраджваюць яму ні пры якіх абставінах, — заўважае **начальнік Клімавіцкага ўчастка паштовай сувязі Дзіна КУЗМЯНКОВА.** — Хоць на працягу апошніх дзевяці гадоў цікавасць да друкаваных СМІ ў насельніцтва паступова падае. Людзі аддаюць перавагу тым з іх, якія спецыялізуюцца на нейкіх асобных кірунках — агародніцтве, рукадзеллі, кулінарыі і гэтак далей. Але мы праз паштальёнаў і падчас сустрэч з насельніцтвам пастаянна нагадваем, што адзіны шанц атрымаць праўдзівую, нескажоную інфармацыю пра тое, што адбываецца ў краіне і за яе межамі, гэта выбраць для сябе дзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
Клімавіцкі раён.

Фота аўтара.

Сямейная газета

Выпуск № 10 (169)

НЕ ШКАДУЙЦЕ ЧАСУ НА ДЗЯЦЕЙ

У мінулую нядзелю мая хросная дачка ішла да першай споведзі. Гэта важны рытуал у каталікаў, які сімвалізуе прыняцце Бога ў сваё сэрца. Да такога ўрачыстага дня дзеці рыхтуюцца доўгія два гады. Вучаць малітвы, спасцігаюць асновы рэлігіі, наведваюць з экскурсіяй святыя мясціны, кожную нядзелю ідуць у касцёл на святую імшу — малыя сталеюць духоўна, вучацца жыць па законе Божым.

У свой час мяне, школьніцу, таксама рыхтавалі да першай споведзі. Нягледзячы на тое, што хрысцілі ў царкве, у касцёл мне хадзіць ніхто не забараняў — бацька-каталік, бабуля і дзядуля па яго лініі ўсяляк падтрымлівалі маё рашэнне стаць бліжэй да Бога. Не быў супраць і ксёндз: ён казаў, што калі пасталею, то сама вызначуся з канфесіяй, а пакуль наведванне касцёла пойдзе толькі на карысць. І гэта сапраўды было няблага. У нас тады ў вёсцы, акрамя школы, займацца асабліва не было чым. Ніякіх табе гурткоў і секцый, куды прынята вадзіць сучасных дзяцей. Таму не дзіва, што хадзіць «на рэлігію» імкнуліся амаль усе школьнікі. І гэта было цікава. Мы не толькі вучылі малітвы і каталіцкія песні, мы глядзелі пэўнай тэматыкі кінастужкі, аб'ездзілі ў акрузе ўсе храмы, рыхтавалі да штотыднёвай нядзельнай імшы выступленні.

Хрэсніца ж мая хадзіла на касцёльныя заняткі пад прымусам — наблізіць дзяўчынку да касцёла хацелі не столькі бацькі, колькі бабуля. Каб дагадзіць ёй, Аляксандра добрасумленна выконвала ўсе заданні, але заняткі не прыносілі ёй асаблівага задавальнення. Хоць бы з той прычыны, што замест адпачынку пасля школы і наведвання шматлікіх секцый трэба было спасцігаць іншую навуку. Магчыма, прычына і ў тым, што мала хто з сучасных падлеткаў шчыра верыць у Бога, яшчэ менш — тых, хто па сваім жаданні ходзіць у храм.

Калі мы хрысцілі свайго Цёміка (малому было тры месяцы), наш вясковы святар, айцец Мікалай, сказаў, што бацькі абавязкова павінны даць дзецям дзве рэчы — Бога і свой вольны час. Каштоўная парада мудрага чалавека. Дзіця, якое з маленства ходзіць у храм (няхай і не кожную нядзелю), ведае пра існаванне Бога, разумее, што крыжык, які вісіць на яго шыі, — не проста ўпрыгажэнне, а таксама імкнецца жыць па 10 запаведзях, вырасце як мінімум добрасумленным і прыстойным чалавекам. А каб яно было яшчэ адукаванае, развітое і выхаванае, сапраўды важна прысвячаць малому свабодны час. «Дзе яго ўзяць?» — скажуць занятыя працоўнымі абавязацельствамі бацькі, якія пасля рабочага дня хочуць адпачыць. Аднак не ва ўсіх атрымліваецца. Асабліва гэта датычыцца жанчын, якія пасля рабочай змены «заступаюць» на дамашняе «дзяжурства».

А што рабіць дзецям? Ім, у рэшце рэшт, усё роўна, прыбрана ў хаце ці не, памыта ці адпрасавана іх адзенне, мала іх хвалюе і тое, колькі часу марнуецца толькі на прыгатаванне ежы. Малыя, якія ўвесь дзень не бачылі сваіх бацькоў, хочуць пабыць з імі побач: не проста сядзець на кухні з мамай, якая абірае бульбу ці варыць суп. Дзеці чакаюць «зваротнай сувязі»: яны хочуць з намі гуляць, паказаць, чаму новаму яны навучыліся ў дзіцячым садку ці школе, проста разам з мамай ці татам паглядзець тыя ж мультфільмы, каб было з кім абмеркаваць убачанае.

Вядома, глядзець з малымі мультыкі, — для занятых бацькоў гэта вялікая раскоша. Аднак па сабе ведаю, што прыярытэты трэба мяняць. Пакіньце нейкую дамашнюю справу на заўтра, на выхадныя. Калі ж не атрымліваецца, падключайце да пэўных абавязкаў малых. Майму Цёміку, напрыклад, толькі за шчасце трымаць у руках пыласос альбо націскаць на распыляльнік сродку для мыцця вокнаў, накіроўваючы яго на шкло. Вядома, мые вокны ў выніку мама, а з пыласосам далей спраўляецца тата. Але малы адчувае, што ён патрэбны, а галоўнае, ён зрабіў нешта разам са сваімі бацькамі.

Не шкадуйце часу на дзяцей. Хадзіце з імі на шпацыры, малюйце ўсялякую бязглуздзіцу, абмяркоўвайце мультыкі і кінастужкі, чытайце разам кнігі — гэта не так шмат, каб ваша дзіця было шчаслівае. Паверце, ваша ўвага, якую вы прысвячаеце сваёй малечы, абавязкова вернецца вам у будучыні.

Вераніка КАНЮТА.

Ад трох да васьмі

Казка на спартыўнай пляцоўцы

Малым патрэбны не мульцікі, а мультыспорт

Усе малыя растуць на мультфільмах, спрэчкі аб карысці ці шкодзе якіх не сціхаюць, здаецца, ніколі. А некаторыя дзеці растуць на мультыспорце, карысць якога аднагалосна прымаецца спецыялістамі і пацвярджаецца вопытам. Пра гэта бясконца можа расказваць Настасся ЛІСОЎСКАЯ — адна з першапраходцаў канцэпцыі мультыспорту ў Беларусі.

У мінулым гарналыжніца, удзельніца першых юнацкіх Алімпійскіх гульняў 2012 года ў Інсбруку, яна сама прайшла школу мультыспорту. Затым пазнаёмілася з замежнымі калегамі падчас юнацкіх алімпійскіх гульняў 2016 і 2018 гадоў, дзе прадстаўляла Беларусь у якасці маладога пасла. Практычныя веды Настасся ўмацавала тэарэтычнымі падчас вучобы ў Расійскім міжнародным алімпійскім універсітэце ў Сочы. І зараз багаты мультыспартыўны вопыт перадае вучням свайго спартыўнага клуба Leski.

Чаму дзяцей трэба захапляць не мультфільмамі, а мультыспортам, Настасся Лісоўская расказала «Сямейнай газеце».

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Колькі гэта каштуе?

ШЧАСЦЕ НЕ Ў ГРАШАХ,

а ва ўменні іх лічыць

Мы рэдка задумваемся пра тое, што дабрабыт чалавека можа залежыць у тым ліку і ад таго, якое стаўленне да грошай яму прывілі ў дзяцінстве, ці навучылі імі распараджацца. Тыя ж кішэнныя грошы ў дзіцяці — гэта выдатны інструмент для фінансавага навучання. І няхай напачатку малыя робяць шмат памылак, трацяць свае зберажэнні «не на тое», негатыўны вопыт таксама вельмі карысны. І няхай лепш хлопчыкі і дзяўчынкі пройдуць праз яго, распараджаючыся малымі грашыма, чым пасля будуць ламаць галаву, як пражыць ад заробку да заробку.

Сакрэты для Волечкі

Калі дачцэ споўнілася пяць гадоў, бабуля на дзень нараджэння падарыла ёй грошы. Ажно 50 тысяч. (Было гэта яшчэ да дэнамінацыі.) Малая пахвалілася старэйшаму сябру з дзіцячай пляцоўкі. Хлопчык адразу ўцяміў, як дзяўчынку «раскруціць» на грошы, захапіў дзве свае купюры па сто рублёў: «Вось у мяне дзве паперкі, ты бяры сваю, і мы закупім прысмакаў». Дзеці набралі цэлую торбу ўсялякіх «лахендрыкаў», а бабуля, якая заспела іх за паяданнем, адразу ўцяміла, на што пайшоў яе падарунак. Пасля сур'ёзнай гутаркі Волечка адкрыла для сябе шэраг грашовых сакрэтаў. Яна даведалася, што купюры маюць сваю вартасць, разабрала разам з бабуляй варыянты, што яшчэ магла б набыць за тую суму. Яны нават пралічылі, на якую пакупку дзяўчынка магла б назбіраць грошай. З таго часу бабуля ўключылася ў «фінансавае» выхаванне ўнучкі, тлумачыла, на што наогул ідуць грошы, паказвала, як робяцца камунальныя плацяжы. Разам хадзілі па прадукты і рэчы, пралічвалі агульную суму пакупак, прыглядаліся, што ў розных крамах цэны на адзін і той жа тавар могуць не супадаць. Да таго ж так бабуля замяніла курсы па падрыхтоўцы да школы. Падчас падобных фінансавых урокаў дзіцяці даводзілася назіраць, чытаць этыкеткі, канцэнтравацца, аналізаваць, лічыць пра сябе.

Давай дамовімся

Так, фінансавае навучанне дзіцяці можа пачацца з сумесных пакупак. Але калі малое толькі сочыць за тым, як вы ўсё робіце, асаблівай карысці не будзе. Можна выдзеліць яму невялікую суму і даць заданне, напрыклад, набыць асобныя прадукты на стол — няхай спрабуе само пралічыць, на што яму хопіць. Не старайцеся адразу выправіць памылкі, дзіця здолее самастойна іх прааналізаваць, каб наступным разам зрабіць лепшыя пакупкі. Можа, спачатку ваш сын выбера дзве машынкі, якія адразу паламаюцца, але наступным разам аддасць перавагу больш надзейным. У знаёмых хлопчык, калі просіць падарункі да дня нараджэння, адразу ставіць умовы: «Вы не набывайце мне некалькі канструктараў. Няхай ён будзе адзін, але дарагі, каб я мог з ім гуляць і зробленае не рассыпалася ў руках. А я вам абяцаю, што буду яго берагчы».

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Такія, як усе

АДАПТАЦЫЯ «АСАБЛІВЫХ» ДЗЯЦЕЙ У ГРАМАДСТВЕ ПАШЫРАЕЦЦА

У Беларусі на розных узроўнях сфарміравана сетка ўстаноў і спецыялістаў, да якіх бацькі могуць звяртацца, калі заўважаюць адхіленні або асаблівасці ў развіцці сваіх дзяцей. Пра гэта паведаміла на прэс-канферэнцыі намеснік галоўнага ўрача Мінскага гарадскога клінічнага дзіцячага псіханеўралагічнага дыспансера, галоўны пазаштатны дзіцячы псіхіятр Міністэрства аховы здароўя Вольга ЛІТВІНАВА.

Яшчэ гадоў дзесяць таму бацькі дзяцей, у якіх ёсць асаблівасці ў развіцці, прасілі ад сістэмы аховы здароўя арганізаваць больш даступную раннюю дыягностыку. Каб мамы і таты, якія заўважаюць, што ў дзіцяці нешта не так з развіццём, ведалі, куды звярнуцца. Вольга Літвінава адзначыла, што Міністэрства аховы здароўя да просьбы прыслухалася. «Навучанне спецыялістаў пярвічнага звяна носіць сістэмны характар. Гэта і разнастайныя лекцыі, семінары, вэбінары на тэму псіхічнага здароўя «асаблівых» дзяцей, і змены праграм паслядыпломнай падрыхтоўкі ўрачоў-педыятраў, неўролагаў і тых, хто непасрэдна працуе ў паліклініцы», — сказала яна.

Спецыяліст упраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Алена МУЛІЦА падчас мерапрыемства адзначыла, што Міністэрства адукацыі вельмі ўважліва ставіцца да сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі «асаблівых» дзяцей у грамадстве і працуе над павышэннем даступнасці і якасці адукацыйнага працэсу для іх. «Сёння можна казаць пра тое, што доступ да атрымання адукацыі забяспечаны ўсім катэгорыям навучэнцаў», — адзначыла Алена Муліца.

Сістэма адукацыі для дзяцей з асаблівасцямі ўключае як установы спецыяльнай адукацыі, так і агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі, у якіх дзеці не толькі вучацца, але і атрымліваюць карэкцыйна-педагагічную дапамогу.

«Сетка ўстаноў прадстаўлена 141 Цэнтрам карэкцыйнага развіцця, 48 спецыяльнымі дашкольнымі ўстановамі для розных катэгорый навучэнцаў з парушэннямі слыху, зроку, мовы, функцый апорна-рухальнага апарату, з інтэлектуальнымі парушэннямі. У сістэме функцыянуюць 24 спецыяльныя агульнаадукацыйныя школы і 24 дапаможныя школы і школы-інтэрнаты», — дадала галоўны спецыяліст.

Акрамя таго, ва ўстановах дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі створана практычна каля дзвюх тысяч спецыяльных груп, 1,5 тысячы груп інтэграванага навучання і выхавання, 167 спецыяльных класаў і больш за пяць тысяч класаў інтэграванага навучання і выхавання. Для атрымання карэкцыйна-педагагічнай дапамогі створана больш за 3,6 тысячы пунктаў карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

У Беларусі на сёння пражываюць каля 35,5 тысячы дзяцей-інвалідаў (з усімі тыпамі і групамі інваліднасці). Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў міжведамаснай рабоце па адаптацыі «асаблівых» дзяцей у грамадстве больш арыентавана на забеспячэнне сацыяльных гарантый: гэта грашовыя выплаты ў выглядзе пенсій і дапамог, дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога, сацыяльныя льготы і гарантыі, паслугі, забеспячэнне сродкамі рэабілітацыі. Але таксама ў сістэме Мінпрацы функцыянуюць дзевяць дамоў-інтэрнатаў для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і адна ўнікальная ўстанова — Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў. З моманту адкрыцця цэнтра ў 2000 годзе рэабілітацыю прайшлі больш чым 21 тысяча дзяцей.

«Толькі за апошнія пяць гадоў інваліднасць знятая ў 59 дзяцей — думаю, гэта паказчык вельмі нядрэнны, — адзначыла **начальнік упраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вікторыя ГРАЧЫХА**. — Паляпшэнне стану назіраецца ў 98 працэнтаў дзяцей».

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Правілы бяспекі

Празмерная цікаўнасць

не даводзіць да дабра

Позна ўвечары 18 мая ратавальнікам Жодзіна паступіла паведамленне: неабходна дапамога дзіцяці, нага якога трапіла ў барабан пральнай машыны. Патэлефанавала і папрасіла аб дапамозе мама хлопчыка. Калі ратавальнікі прыехалі на месца, высветлілася, што дзіця знаходзіцца ў такім становішчы прыкладна 20 хвілін. Падчас аказання дапамогі ратавальнікі гутарылі з падлеткам, падбадзёрвалі і супакойвалі. Незвычайная аперацыя была завершана паспяхова.

Напэўна, дарасламу цяжка ўявіць, што дзіця можа трапіць у падобную сітуацыю. Аднак фантазія і забавы малых часам не маюць межаў.

У гэты ж дзень, пасля 19-й гадзіны ў службу ратавання Гомеля паступіў званок ад дзяўчынкі. Дзіця растлумачыла, што падчас гульні залезла на дрэва і цяпер не можа самастойна спусціцца. Праз некаторы час ратавальнікі з дапамогай трохкаленнай лесвіцы знялі дзяўчынку з дрэва, з вышыні каля пяці метраў — гульня скончылася добра. У гэтай сітуацыі выратавала тое, што ў дзіцяці з сабой быў мабільны тэлефон. Важна, што дзяўчынка не разгубілася і не запанікавала, а патэлефанавала туды, куды трэба, і папрасіла аб дапамозе.

Днём раней, 17 мая, сталічным ратавальнікам паступіў трывожны званок ад хлопчыка, які паведаміў, што яго сябру патрэбна дапамога. Надзвычайная сітуацыя адбылася на будаўнічай пляцоўцы па вул. Княгінінскай. Нага дзіцяці аказалася пад элементамі бетоннага блока. Работнікамі МНС з дапамогай гідраўлічнага інструмента ён быў дэблакіраваны, дзіця перадалі медыкам. На жаль, у гэтым выпадку не абышлося без траўмаў.

Ратавальнікі пастаянна паўтараюць, што будоўля — не месца для дзіцячых гульняў. Але ж менавіта будоўлі, пустуючыя катлаваны, кар'еры часта прывабліваюць дзяцей, хоць гэтыя месцы хаваюць у сабе небяспеку нават для дарослых. Дзятва любіць будаваць лабірынты, лазы, пячоры ў пяску, але пясок вельмі каварны. Абвальванне грунту адбываецца маментальна, і магчымасці выбрацца з-пад завалу практычна няма.

Усе пералічаныя выпадкі вельмі розныя. Але іх аб'ядноўвае адно — у кожнай надзвычайнай сітуацыі пацярпелымі сталі дзеці. Добра, што гэтыя сітуацыі скончыліся без ахвяр. Аднак наступствы могуць быць розныя: траўмы, інваліднасць, а часам і гібель дзіцяці. У любой падобнай сітуацыі дарослым даводзіцца вінаваціць толькі сябе за тое, што недагледзелі, не патлумачылі, не папярэдзілі, не навучылі...

З самага нараджэння малое імкнецца пазнаваць свет, таму нельга пакідаць яго без нагляду нават на секунду. Вельмі часта дзяцей прыцягваюць дробныя прадметы, якія можна праглынуць так хутка, што дарослы нават не заўважыць. Захоўваць такую драбязу трэба ў недаступным для дзіцяці месцы: манеты — у кашальках, батарэйкі — у скрынях і г. д. Цацкі дазваляць толькі тыя, што адпавядаюць узросту. Прадметы, прызначаныя для старэйшых дзяцей, могуць утрымліваць дробныя дэталі, а значыць, небяспечныя для малых. Нельга таксама выкарыстоўваць у якасці цацак прадметы побыту, напрыклад, пульт ад тэлевізара ці гадзіннік.

7 сакавіка ў Лунінецкім раёне з акна трэцяга паверха выпала пяцігадовая дзяўчынка. У гэты момант маці спала. Застаўшыся без нагляду, малая хацела вылезці на вуліцу праз фортку на кухні. Аб бядзе паведамілі суседзі. Дзяўчынку з траўмамі даставілі ў бальніцу.

Адчыненыя вокны выклікаюць у ратавальнікаў асаблівую трывогу. Гібель дзяцей і рознай ступені цяжкасці траўмы, інваліднасць — гэта можа быць вынікам пакінутага без нагляду дзіцяці каля адчыненага акна. Нават маскітная сетка на вокнах не з'яўляецца перашкодай. Не адзінкавыя выпадкі, калі, абапёршыся на яе, малое разам з сеткай аказваецца за акном. Вельмі важна не толькі забараняць, але і тлумачыць, чаму нельга гуляць каля адчыненага акна і якія могуць быць наступствы.

Доўгачаканыя летнія канікулы пачынаюцца ў школьнікаў. Вельмі важна, каб адпачынак дзяцей быў бяспечны. Спланаваць яго павінны, вядома ж, бацькі. Загадзя прадбачыць, дзе і што можа здарыцца, зразумела, немагчыма. Але пастаянныя стасункі з дзецьмі, тлумачэнне той ці іншай сітуацыі заўсёды дадуць станоўчы вынік. Магчыма, і самі дарослыя не заўсёды ведаюць правільны выхад у нейкай сітуацыі. Вучыцца ніколі не позна! Пазнавайце, вывучайце, асвойвайце разам з дзецьмі жыццёва неабходныя правілы.

Ратавальнікі жадаюць усім малым і дарослым бяспечнага летняга адпачынку!

Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ, галоўны спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС.

ШЧАСЦЕ НЕ Ў ГРАШАХ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Наступным крокам можна даверыць дзіцяці пакупкі прадуктаў, якія раней рабілі дарослыя. І неабавязкова вы будзеце пасылаць яго толькі па хлеб з малаком. Няхай паступова вучыцца абслугоўваць сябе: напрыклад, набываць бутэлечкі з вадой, якія возьме на спартыўную трэніроўку, ці прадукты для перакусу ў школе, сшыткі, канцтавары, а ў падлетка-вым узросце ўжо здолее выбраць сабе новыя красоўкі ці футболку.

Спачатку варта тлумачыць, на што вы даяце грошы. Але, каб фінансавае навучанне было паўнавартасным, важна, каб дзіця мела пастаяннную крыніцу даходаў. Так, калі яно будзе ведаць, што ў пэўныя дні рэгулярна атрымае агавораную суму, зможа нават планаваць пэўныя па-

купкі, прыглядацца да цэн у крамах, задумвацца, што лепш: набыць шакаладку ці пабярагчы грошы для іншай пакупкі. Менавіта з уласных зберажэнняў падлетак набывае падарункі да дня нараджэння сяброў ці білеты ў кіно. Загадзя прагавораныя правілы дапамагаюць дзіцяці сарыентавацца ў сітуацыі. Яно будзе ведаць, што рабіць, каб атрымаць жаданы вынік, напрыклад, зможа адкладаць грошы на новы мабільнік ці паездку з сябрамі. А яшчэ ў сямейных дагаворах ёсць вельмі каштоўны «пабочны эфект»: дзеці вучацца супрацоўнічаць, дамаўляцца, абмяркоўваць умовы. Такія навыкі ім спатрэбяцца ў дарослым жыцці.

Грашовыя сумы могуць павялічвацца з узростам дзіцяці. Але важна не адступаць ад агавораных загадзя правіл. Калі ваш сын ці дачка «спусцілі» грошы на нешта не вельмі патрэбнае, не выдавайце яму дадатковую суму. Да таго ж з ростам патрэб такое стаўленне бацькоў паступова будзе падводзіць нашчадкаў да думкі аб магчымасці зарабіць. Наогул, карысным будзе прагаворваць з дзецьмі варыянт, што праз некаторы час яны будуць жыць самастойна.

Таксама можаце падключыць дзіця да распараджэння фінансавым бюджэтам сям'і. Напрыклад, скажыце, што вы можаце выдзеліць пэўную суму на дадатковае навучанне, і няхай дзіця само выбірае, што важней: курсы ігры на гітары ці спартыўная секцыя. А чаму б не абмяркоўваць з дзецьмі вялікія сямейныя выдаткі? Можна разам вырашаць, што лепш: набыць новы тэлевізар ці з'ездзіць адпачыць?

Важна фарміраваць правільныя адносіны да грошай, паказваць, што яны даюць новыя магчымасці. Гэта ці не лепшы матыватар для дзіцяці, каб удасканальваць сябе, вучыцца і ў далейшым атрымаць добрую працу.

Не ўсё можна купіць

Сямейныя канфлікты, звязаныя на грошах, таксама могуць уплываць на фарміраванне асобы дзіцяці.

Папрокі ў дрэнных заробках, завышаныя патрэбы, няўменне распараджацца грашыма могуць пачынацца там, дзе не хапае цеплыні. Псіхолагі адзначаюць: калі наладжваюцца ўзаемаадносіны паміж сужэнцамі, паступова закрываюцца і фінансавыя прэтэнзіі адзін да аднаго. Гэта міф, што з вялікімі грашыма можна адчуваць сябе спакойным, упэўненым і задаволеным. Гарманічныя адносіны не купіш ні за якія грошы.

На жаль, часта грашыма бацькі спрабуюць адкупіцца ад дзяцей. Новымі цацкамі, пачастункамі, білетамі ў забаўляльны цэнтр занятыя бацькі спрабуюць кампенсаваць недададзеныя дзецям час, увагу, клопат. І такім чынам фарміруюць у дзяцей няправільнае стаўленне да грошай і рэчаў. Малыя прызвычайваюцца да іх бясконцага паступлення. У выніку і тое, што яны ўжо маюць, часта не цэняцца. Такія хлопчыкі і дзяўчынкі не сочаць за сваімі рэчамі, не берагуць іх і ўвесь час патрабуюць новых падарункаў. Не трэба спяшацца адразу задаволіць усе запыты дзіцяці. Магчыма, малому патрэбна не столькі цацка, колькі пацвярджэнне, што яго любяць. Вось толькі яно не ведае, як данесці да родных людзей гэтае сваё жаданне.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Казка на спартыўнай пляцоўцы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Настасся, ці ёсць канкрэтнае азначэнне мультыспорту? Колькі відаў павінна быць аб'яднана, каб казаць пра яго?

— Канкрэтнага акадэмічнага азначэння няма. Калі я вучылася ў Сочы і сур'ёзна цікавілася тэмай, вывучаючы замежную практыку, заўважыла, што гэта не так шмат дзе развіта. Новая Зеландыя, Аўстралія, Канада — лідары. Там працуе мноства клубаў з вялікай колькасцю дзяцей самага маленькага ўзросту, якія займаюцца і баскетболам, і тэнісам, і валейболам, і яшчэ шмат чым. І вось гэта такі класічны мультыспорт. Чаму ў нас я займела нахабства казаць пра мультыспорт? Таму што галоўнае — не колькасць відаў спорту, а сістэмнасць заняткаў. Не так, што сёння адно, заўтра іншае. Усё павінна быць узаемазвязана. Гэтай зімой нашы дзеці займаліся ролікамі, і некаторыя па жаданні хадзілі на заняткі па горных лыжах. Падрыхтоўка па гэтых відах спорту пераплятаецца. Дзякуючы ролікам, яны ўмеюць трымаць баланс, раўнавагу, умеюць адштурхоўвацца і пераносяць гэта на лыжы.

«Я за ўдзел бацькоў, але не за ўмешванне іх у працэс трэніроўкі — так падрываецца аўтарытэт трэнера».

— А хто першы пачаў выкарыстоўваць такую канцэпцыю ў рабоце з дзецьмі?

— Хто першы ў свеце, я не ведаю, імя першаадкрывальніка нідзе не згадваецца. Мне здаецца, гэта прыйшло з агульнай практыкі трэнераў. Шматлікія спецыялісты лічаць, што ранняя спецыялізацыя для дзяцей не проста не пажадана — яна нават шкодная для мышачнага і касцявога апарату, пры сур'ёзных занятках адным відам спорту пачынаюцца экстрэмальныя, сур'ёзныя практыкаванні... Прывіццё дзецям любові да актыўнай дзейнасці, а не да спорту, дзе абавязкова трэба перамагаць, першапачаткова гэта гульня — вось што добра. Прачытала недзе добры выраз пра тое, «як шмат дзяцей мы страцілі, калі перасталі з імі гуляць». І гэта асноўнае.

— А як ты пачала працаваць у гэтым кірунку?

— Практыка пайшла з уласнай практыкі. Калісьці я займалася горнымі лыжамі. Пакольк гэта складанакардынацыйны від спорту, зімой, акрамя саміх лыж і летніх збораў у Аўстрыі, было міжсезонне, і яго трэба было нечым займаць: ролікі, водныя лыжы, дадаткова мой тата вадзіў нас з братам на бадмінтон і тэніс. Усё гэта не паглыбляючыся, а каб атрымаць розныя навыкі. Дзякуючы тату мы крыху займаліся конным спортам, акрабатыкай. Падчас вучобы ў БДУФК з'явілася ўнутранае пытанне: што рабіць далей. І тата параіў аб'яднаць усё, што я ўмею і магу, дзеля агульнага аздараўлення і ўмацавання дзяцей.

— У якім узросце дзеці могуць пачынаць займацца мультыспортам?

— Аптымальны ўзрост — 3—3,5 года. Здавалася б, паўгода розніцы, але насамрэч яна адчувальная. У нас ёсць малы, які пачаў займацца ў тры гады і два месяцы, і ўжо відаць вынікі. І бацькі кажуць, што яму падабаецца хадзіць толькі на трэніроўкі, а не ў сад ці яшчэ кудысьці. Тут пытанне ў тым, што да трох гадоў дзецям патрэбна мама, яны жывуць у фармаце мама — малы.

— Колькі відаў спорту дзіця можа сумяшчаць адначасова і па якім прынцыпе яны аб'ядноўваюцца?

— Тут трэба шукаць залатую сярэдзіну і пастаянна эксперыментаваць. Практыка паказала, што дзеці за тры месяцы могуць засвоіць базавыя навыкі па кожным відзе спорту. Калі з нуля пачынаюцца, напрыклад, ролікі, то праз тры месяцы малыя ўжо не проста стаяць і тупаюць, а катаюцца. Вынікі ў гімнастыцы ці акрабатыцы складаней адсачыць, але відаць, што дзіця можа зрабіць кола, кулёк. А можа проста слухаць каманды трэнера і выконваць заданні, гэта нябачны вынік, але вельмі важны. У такім узросце важная і ментальная трэніроўка дзяцей, яны павінны разумець, што ёсць трэнер, мы яго слухаем і робім тое, што ён казаў. Няма прынцыповай важнасці, што за чым ідзе. Таму што наша мэта — развіццё, аздараўленне і жаданне дзяцей ісці на заняткі.

— А фізіялагічныя патрабаванні да сумяшчэння відаў спорту ёсць?

— Ёсць, канешне, але гэта не закон. Лепш за ўсё пачынаць з гімнастыкі. Яна дапамагае пасля лета, пасля канікул прывесці дзяцей у тонус, дысцыплінуе. Як я ўжо казала, добра, калі ролікі сумяшчаюцца з лыжамі. Абавязкова трэба ўключаць агульную фізічную падрыхтоўку. У кожным відзе спорту акцэнт робіцца на пэўную частку цела, а агульная падрыхтоўка задзейнічае ўсе групы мышц. Гэта базавыя веды, якія патрэбны ўсюды.

— Чаму такое папулярнае меркаванне, што дзеці павінны займацца плаваннем, што гэта бадай ці не галоўны від спорту для малых?

— Для дзяцей плаванне вельмі важнае. Нездарма ў нас так шмат школ па плаванні. Плаванне — гэта ўмацаванне мышачнага карсета, пазваночніка. Улічваючы, што ў нас нават дзеці вядуць малаактыўны лад жыцця, сядзяць у тэлефоне, плаванне расслабляе мышцы, эмацыйна разгружае. Мы ўсе з вады прыйшлі і з яе складаемся. Гэта вельмі добрая асяроддзе для дзяцей. Але вельмі важна трапіць у прафесійныя рукі трэнераў. Яны — «слаўны», на якіх усё трымаецца.

«Дзяцей не падманеш. Яны адчуваюць, як да іх ставіцца дарослы чалавек, і ад гэтага залежыць вынік».

— Настасся, у якім узросце ўжо можна думаць пра сур'ёзную спартыўную будучыню?

— Гэта вельмі надзённае пытанне. З дзецьмі ад 3 да 8 гадоў фармат мультыспорт і агульнае развіццё — выдатна. А прыкладна з васьмі гадоў у бацькоў узнікае патрэба вызначыцца, многім хочацца паглыблена займацца адным відам. І тут патрэбна працаваць і з бацькамі. Яны павінны разумець, што сур'ёзны спорт — гэта новае жыццё і для дзіцяці, і для бацькоў, гэта дысцыпліна, новы ўклад і іншы свет. Калі казаць пра ўзрост, то па некаторых відаць і ў чатыры, і ў пяць гадоў, ці чакае спартыўная будучыня.

— Вось што канкрэтна відаць?

— Напрыклад, ідзе трэніроўка па гімнастыцы, усе стаяць, робяць практыкаванні, а адзін не можа проста выстаяць на месцы, пастаянна яму нешта трэба рабіць. Ён пераходзіць на ролікі, дзе ўсе ганяюць, дзе ў іх свабода — і там ён у сваёй стыхіі. А тыя, хто сталі, зрабілі, добра пацягнулі насочкі, — гэта не іх, яны могуць развівацца ў той жа гімнастыцы. І вось такія якасці характару можна накіроўваць далей. Па адных адразу відаць, па іншых складана сказаць: там ужо трэба глядзець, куды дзіця ідзе з лепшым настроем. Каля шасці гадоў дзеці ўжо падужэлыя, у іх ёсць каардынацыйная база, добра развіты вестыбулярны апарат, яны ментальна больш гатовыя, ведаюць, як сябе паводзіць на трэніроўках. І, гледзячы на дзіця, можна выбраць аптымальны для яго від спорту.

— Ці ёсць нейкія звесткі, як склаліся спартыўныя кар'еры людзей, якія пачыналі менавіта з мультыспорту?

— Не, яны яшчэ не паспелі вырасці. Калі ўзяць прафесійных спартсменаў у любым відзе спорту, то тыя ж футбалісты займаюцца лёгкай атлетыкай, гімнастыкай, акрабатыкай. Яны вучацца цягнуць «насочак», трэніруюць выносліваць, гнуткасць і іншае. У прафесійным спорце ўсе разумеюць, што трэба развіваць розныя навыкі.

— На твой погляд, якой павінна быць роля бацькоў у трэніровачным працэсе дзяцей?

— Я разумею мам, якім хочацца паглядзець, як усё праходзіць, як сябе паводзіць дзіця, як працуе трэнер. Для гэтага ёсць адкрытыя заняткі. Але практыка паказала, што добра, калі бацькі і дзеці не бачаць адзін аднаго. Зразумела, што дзеці паводзяць сябе інакш без нагляду бацькоў.

Напрыклад, бацькі прыводзяць да мяне дзіця на індывідуальны занятак па горных лыжах і кажуць, што яно сёння лянуецца, бурчыць. Я даю бацькам магчымасць прагляду заняткаў на адлегласці, без каментавання трэніровачнага працэсу. І бачу зусім іншае дзіця. А яны потым самі дзівяцца. Дзеці трансфармуюцца пад таго, хто з імі ўзаемадзейнічае і як. Асабіста я за тое, каб бацькі былі на адлегласці, каб яны маглі бачыць дзяцей, а дзеці іх — не. Гэта таксама і пытанне даверу да трэнера. Я за ўдзел бацькоў, але не за ўмешванне іх у працэс трэніроўкі — так падрываецца аўтарытэт трэнера. Бацькам я жадаю быць побач, падтрымліваць і ганарыцца сваім дзіцем, незалежна ад вынікаў.

— Як ты ставішся да таго, што некаторыя бацькі аддаюць дзяцей у спорт, жадаючы задаволіць свае амбіцыі?

— Сапраўды, ёсць такая праблема. Я бачыла шмат такіх сітуацый яшчэ падчас сваёй спартыўнай кар'еры. Добра, калі дзіцяці падабаецца тое, чым яно займаецца. У супрацьлеглым выпадку растуць псіхалагічна траўміраваныя дзеці. Я бачыла сітуацыі, калі трэнер-бацька прымушаў сваё дзіця праз сілу займацца спортам. І ў дзіцяці заўсёды былі апушчаны вочы. Іншы момант, што цяпер дзеці вельмі свабодалюбівымі становяцца, выказваюць бацькам, што ім падабаецца, што — не. Амбіцыі бацькоў — цяжкая вялікая тэма, і ў гэтым няма нічога добрага. Трэба ж разумець, што дзіця — іншы чалавек, пакуль маленькі фізічна, але ж чалавек! І трэба даваць яму свабоду выбару і магчымасць выбраць сваё, і гэта ўсё павінна быць з задавальненнем.

— Настасся, які твой галоўны прынцып як дзіцячага трэнера?

— Самае галоўнае для мяне — бяспека. А бяспека раўняецца дысцыпліна. Падчас заняткаў дзеці павінны працаваць, ім патрэбна магчымасць пасваволіць, але гэта абавязкова павінна быць бяспечна для іх. А дысцыпліна, бяспека — гэта ўжо адказнасць і паказчык прафесіяналізму трэнера. Галоўнае — захоўваць гульню, гуляць з дзецьмі. І я, працуючы непасрэдна з дзецьмі, кожны раз лунаю з імі ў казках. Сёння ён матылёк, заўтра тыгр, паслязаўтра супермен, потым снегавік і яшчэ нешта. На трэніроўцы ў кожнага ёсць ролі, усё, што робім, звязана ў нейкі казачны ігравы сюжэт. У нас ёсць чароўная лыжа, мы павінны яе пацерці аб сняжок. Малы проста слізгае на лыжах і прывыкае да іх, трымае баланс. Я спецыяльна скончыла курсы па методыцы работы з дзецьмі на горных лыжах. Гэтая методыка каласальна адрозніваецца ад дарослай. З дзецьмі вы не проста коціцеся на адной ножцы, вы праязджаеце ўмоўны вадаём, таму трэба падняць нагу. У дзіцяці павінны быць візуальныя вобразы, а не проста «злева-справа», «уверх-уніз». У мяне гэта ўсё ідзе проста з галавы, бо канкрэтна пад кожнае дзіця патрэбен свой сцэнарый: яны ж усе рознья. Вядома, для трэнера гэта больш энергазатратна. З дарослымі можа працаваць практычна кожны трэнер, а з дзецьмі — іншая справа. Дзяцей не падманеш. Яны адчуваюць, як да іх ставіцца дарослы чалавек, і ад гэтага залежыць вынік.

— Пакуль ты вучыш дзяцей катацца на горных лыжах, чаму навучылася сама?

— Яны настолькі шчырыя ў сваіх праявах, што скакаць з імі, гуляць — такое задавальненне, такая любоў, і дзеці гэта адчуваюць. Мяне яны навучылі быць заўсёды сумленнай, шчырай. Самае галоўнае — быць справядлівай. Справядлівасць, сумленнасць — гэта ўсё пра дзяцей. Ты можаш быць строгім, але справядлівым, і яны будуць цябе любіць. А можаш недзе схітрыць, і яны гэта адразу адчуюць. Гэта такі антыстрэс: я з імі пра ўсё забываю — пра турботы, клопаты. Гэта чысты ліст, на які глядзіш і разумееш: яны да цябе прыйшлі — значыць, давяраюць, нечага чакаюць, і ты павінен гэтаму адпавядаць.

«Сур'ёзны спорт — гэта новае жыццё і для дзіцяці, і для бацькоў, гэта дысцыпліна, новы ўклад і іншы свет».

— На твой погляд, чэмпіёнамі нараджаюцца ці становяцца?

— Я думаю, што ўсё ж такі становяцца. А можа быць, і нараджаюцца... Але гэта можна сказаць не толькі пра спорт. Ёсць чэмпіёны ў мастацтве, навуцы. Але ўсё роўна галоўнае — знайсці зерне, якое можа прарасці. Усё вакол павінна сысціся ў адной кропцы, пачынаючы ад здольнасцяў дзіцяці. Яно можа быць тысячу разоў таленавітым, але не старанным. На адным таленце далёка не выедзеш. Працавітасць і самадысцыпліна таксама вельмі важныя.

Валерыя СЦЯЦКО.

Спявачка МІШЭЛЬ:

«Я ЛЮБЛЮ ПЕРААДОЛЬВАЦЬ СВАЕ СТРАХІ»

Мая гераіня занялася спартыўнымі трэніроўкамі падчас пандэміі, бо, як кажа сама, характар не дазваляе сядзець без справы і руху. І сапраўды, пры першай сустрэчы адразу ж заўважаеш яе вытанчаную фігуру, імпэт і энергічнасць, прыгажосць вачэй, шчырую ўсмешку... Нягледзячы на тое, што мая суразмоўніца лічыць сябе добрай гаспадыняй, у доме якой пахне пірагамі і ўсё блішчыць ад чысціні, яна цудоўна сумяшчае свае творчыя камандзіроўкі па краіне і педагагічную дзейнасць. А яшчэ яе песня «Кудзеля» 23 тыдні трымалася на першых прыступках хіт-параду тэлеперадачы «Наперад у мінулае». Як ёй удаецца знайсці ў сутках 25-ю гадзіну, чытайце далей у нашым інтэрв'ю.

«Была ў шоку, калі прайшла на бясплатнае»

— Яшчэ ў школе мне падабалася вывучэнне замежных моў, другой моваў была французская, — пачынае гутарку з гісторыі ўзнікнення свайго творчага псеўданіма Мішэль. — Надышоў момант паступлення ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, вельмі хацелася быць артысткай, бо падчас вучобы ў бараўлянскай гімназіі я займалася ў сур'ёзным калектыве «Арфей» пад кіраўніцтвам Таццяны Солдак. Мы ўдзельнічалі ў розных конкурсах — «Усе мы родам з дзяцінства», «Сузор'е надзей», атрымлівалі Гран-пры. Бацькі мяне падтрымалі, сказалі, што дапамогуць на шляху да мары, а ці змагу я выкарыстаць свой шанц у жыцці або не — будзе мой выбар! Я не мела права расчароваць бацькоў! Вядома, я была ў шоку, калі прайшла на бясплатнае, а там такі конкурс! Я паступіла на вакальна-эстраднае аддзяленне, нас аказалася ўсяго трое на бюджэце, гэта, канешне, было вельмі прыемна. Я пазнаёмілася з Леанідам Шырыным, які пісаў мае першыя песні... Тады і спытаў, які хачу псеўданім. Ведаў, што я захаплялася французскай мовай, кажа, а няхай будзе Мішэль. Я згадзілася, бо гэта можна было звязаць і з памяццю аб маім дзядулі, якога звалі Міхась, ён быў добры, адкрыты чалавек. Цяпер мяне амаль паўсюль называюць Мішэль, нават дома *(смяецца)*.

«Барацьба — гэта прыемна»

— Конкурсы, як і спаборніцтвы, нясуць у сабе момант барацьбы. Аднак для мяне вельмі важныя стасункі — я набываю мноства новых сяброў, а гэта вялікі плюс. Заўсёды хочацца перамагчы, аднак, калі бачу, што ёсць людзі, мацнейшыя за мяне, і калі яны перамагаюць, гэта насамрэч зразумела. На конкурсе Turkvision-2020, напрыклад, вельмі кампетэнтнае журы, гэта было відаць па балах. Мы, артысты, таксама сачылі і рабілі стаўкі. Калі ёсць шчырая канкурэнтная барацьба — гэта заўсёды прыемна. Мне аднойчы сказалі: не імкніся быць першай сярод самых слабых, нехай ты будзеш дваццатай, але сярод самых моцных у свеце, — і я стараюся гэтага прытрымлівацца. Напрыклад, мне шчыра падабаецца песня «Кудзеля», якую выконвала ў тэлеперадачы «Наперад у мінулае». Памятаю, прыехала на студыю да Сяргея Сухамліна, ён кажа: «Ну давай, паспрабуем запісаць». Праспявала, ён гаворыць: «Усё, запіс прайшоў, ты выканала з першага дубля бездакорна». Песня пайшла ў народ. Цяпер знаходжуся на дошцы гонару гэтай перадачы (смяецца). А яшчэ думаю аб творчым канцэрце і хачу яго запланаваць на пачатак будучага года, люблю да ўсяго рыхтавацца адказна.

«Зрабіла сабе карэ»

— Люблю, калі гавораць праўду ў вочы. І на сцэне стараюся весці сябе так, як і ў жыцці. Напрыклад, калі спяваю песню «Хаціна», у мяне заўсёды слёзы, бо гэты твор дарагі: успамінаю сваіх бацькоў... Мяркую, глядач бачыць, калі артыст шчыры, гэта, мне здаецца, вельмі важна. Да крытыкі стаўлюся адэкватна. Калі цябе крытыкуюць, значыць, табой цікавяцца, чымсьці ты зачапіў. У мяне заўсёды былі доўгія валасы. І ў нейкі момант вельмі блізкі мне чалавек сказаў: «Слухай, нешта ў творчасці ты заварылася, давай зменім прычоску». Я пайшла і зрабіла сабе карэ ды чолку. І праз месяц паўдзельнічала ў нацыянальным адборы на «Еўрабачанне» ў неверагодным вобразе, мяне не пазнавалі! Цяпер я спакойна стаўлюся да змены вобраза. Складана, напэўна, для мяне перафарбаваць валасы ў рыжы, аднак, думаю, настане той момант, калі і гэта можа адбыцца *(смяецца)*.

Фота Антоніі КУЗНЯЦОВА.

«Ніколі не кажы «ніколі»

— Пасля вучобы ва ўніверсітэце і атрымання спецыяльнасці «Артыст эстрады. Выкладчык вакалу» я апынулася па размеркаванні ў Радашковічах, у Доме культуры. Ездзіла кожны дзень на маршрутцы на работу. Выкладала там у вакальнай студыі «Мішэль». Цяжка спачатку даводзілася, бо трэба ж назапашваць педагагічны вопыт. У мяне былі вельмі добрыя дзеці, слухаліся. Вясёлы быў час: адначасова ў Дом культуры размеркавалі трох маладых спецыялістаў — рэжысёра, харэографа і вакалістку. Мы пасябравалі, адпрацавалі на адным дыханні. Пасля я для сябе вырашыла, што выкладанне — не маё. Але аднойчы патэлефанаваў мой знаёмы і кажа: «Дапамажы: выкладчык паехаў на гастролі, трэба замяніць». Гэта была прыватная школа. Я пачала падымаць усе свае ўніверсітэцкія запісы: там жа дарослыя людзі, і трэба было заявіць пра сябе, вельмі перажывала. Але так уцягнулася, што мне пачалі званіць па рэкамендацыях. Тады падумала: ніколі не кажы «ніколі». Цяпер у мяне свая прыватная школа вакалу. Сярод вучняў — і актрыса, і трэнер па фігурным катанні, і нават маленькія дзеткі. Запісацца на прыватныя ўрокі можа кожны ахвотны, бо, лічу, калі чалавек хоча — гэта ўжо паўшляху да поспеху.

«Калі заплюшчыць вочы — кітаянка»

— Адзін з прадукцыйных і бясцэнных вопытаў адбыўся у маёй творчасці 11 гадоў таму — гэта вывучэнне песні на кітайскай мове падчас гастроляў з Дзяржаўным ансамблем танца Беларусі па Кітаі. За месяц мне сказалі: «Ты з намі ляціш»: колер валасоў — тое, што трэба для Кітая, нос — таксама *(смяецца)*, аднак трэба вывучыць песню на кітайскай мове. Я сядзела днём і ноччу, перапісвала рускімі літарамі кітайскія гукі, кожны дзень адкрывала для сябе нешта новае. У Кітаі мясцовы імпрэсарыа за дзень да выступлення папрасіў зрабіць здачу канцэрта. Я выйшла, праспявала. Падыходжу, пытаюся: «Можа, трэба нешта папраўіць», бо яна ўвесь час маўчала. Тая гаворыць: «Якія праблемы, вы праспявалі, калі заплюшчыць вочы, як кітаянка». Пасля ўжо нам з маім калегам неабходна было падрыхтаваць твор на кітайскай мове для дуэта. Скажу шчыра, мы вывучылі песню за ноч у цягніку. Вельмі прыгожа атрымалася.

«З гэтым я спраўлюся»

Трэба прайсці любы бар'ер, які нам ставіць жыццё, бо я дакладна ведаю: калі страшна, туды трэба ісці і гэты страх прайсці. У дзяцінстве я правалілася пад лёд, і ў дарослым жыцці ездзіць кожны год на мора і заходзіць у ваду па калена лічыла недарэчным. Вырашыла, што з гэтым спраўлюся. Знайшла сабе цудоўнага інструктара і наноў навучылася плаваць. Я люблю пераадольваць свае страхі. Заўсёды гавару сабе: у мяне ўсё атрымаецца. Мяне запэўнівалі, што я ніколі не буду кіраваць машынай, я сказала: «Буду». І цяпер без «абаранкі» не ўяўляю жыццё! *(Смяецца.)*

Гэтая ўпартасць у мяне з дзяцінства. Памятаю, калі была маленькай, у мяне быў вельмі ціхі голас. Аднак так хацела стаць салісткай. Тата расказваў, калі яны з мамай з'язджалі, я ўключала песні і спявала гучней, займалася на фартэпіяна па чатыры гадзіны штодзень, вялікі дзякуй маёй настаўніцы Вользе Леанідаўне Івановай, бо менавіта яна дапамагла ў дзяцінстве здзейсніць мару — займацца музыкай, паверыла ў мяне, і я дагэтуль сябрую з ёй! Таму, абапіраючыся на свой дзіцячы вопыт, разумею: калі чалавек сапраўды хоча, ён абавязкова прыйдзе да выніку.

Фота Таццяны ГЛУШКОВАЙ.

«Са мной невыносна жыць»

— Мне чамусьці заўсёды дораць мядзведзікаў, а знаёмыя называюць мядзведзікам. Аднак, мне здаецца, я не такая ўжо і мяккая *(смяецца)* — са мной невыносна жыць.

Я такі чалавек — люблю, каб заўсёды ў доме быў парадак, каб ежа была нагатавана. Нядаўна сур'ёзна хварэла — ангіна, тэмпература амаль 40. Ляжу і бачу: на падлозе — пыл. Не, думаю, ляжаць я не буду. Вярнаецца муж з работы і гаворыць: «Ты ж хворая, навошта прыбірала, а суп навошта варыла, адбіўных нарабіла?.. Добра, а торт навошта спякла?!» *(Смяецца.)* Я не магу без справы сядзець і вельмі люблю гатаваць. Увогуле, рыса майго характару — яна ж устаноўка — ніколі не спыняцца. Бывае, выязджаю з дому а 9-й гадзіне, а прыязджаю а 23-й, а то і пазней. І думку, што можна крыху паспаць, стараюся праганяць, бо лянота спараджае рэгрэс. На мяне нават трэнер сварыцца пастаянна, не дапусціў да трэніроўкі, калі хварэла, хоць я вельмі таго хацела, бо самае цяжкае для мяне — ляжаць і нічога не рабіць.

Характар у мяне той яшчэ. Разумею, што дзесьці можна было б і прамаўчаць, бо сужэнец і бацькі вельмі дапамагаюць з дачкой. Урокі, праўда, на мне, я сама так вызначыла. Хоць, здаецца, мой муж, архітэктар, многага не заўважае, за 18 гадоў ён ужо прывык. Калі сур'ёзныя мерапрыемствы ці канцэрты, прашу, каб муж з дачкой паехалі да маіх бацькоў на пэўны час, каб я змагла дома выспацца, падрыхтавацца. Бо калі Аліса дома, я люблю з ёй чым-небудзь цікавым заняцца: памаляваць, паляпіць, паглядзець фільм і г. д. Бывае, яна заходзіць да мяне на кухню і кажа: «Мама, перашкаджаю?» Я кажу: «Не», а яна: «Пагаворым?» І пачынае... *(Смяецца.)* Дачка, дарэчы, таксама ўжо гатуе. У васьмігадовай Алісы ёсць свае фірменныя рэцэпты печыва — толькі яна займаецца цестам для яго, сама пячэ прысмакі на святы ў школу.

Надзея ЗУЕВА.

❍ Пажаданне ад зоркі

Усе мае песні пра каханне. Таму жадаю чытачам знайсці сваё каханне, а калі знайшлі — то захаваць і ўтрымаць яго, не даць адбыцца якой-небудзь памылцы, што можа парушыць два жыцці. У мяне ёсць песня «Зоры», (аўтары Фёдар Жыляк і Надзея Ждан), раю паслухаць. Я заўсёды слухаю тэкст, каб абавязкова ў ім быў сэнс. І калі адчуваю водгук у сэрцы, бяру ў свой рэпертуар.

ПРАВА МАЮ,

або Відэалайфхакі ад дзяцей

Конкурс відэароліка ў «Прававы лайфхак «У мяне шчаслівае дзяцінства — гэта маё права» для дзяцей і падлеткаў ад шасці да 17 гадоў пачаўся на Дзіцячым прававым сайце. Работы на крэатыўнае спаборніцтва, арганізаванае Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам юрыстаў, прымаюцца да 30 чэрвеня.

Конкурс скіраваны на фарміраванне прававой і інфармацыйнай культуры падлеткаў. Удзельнікі могуць даслаць свае работы (індывідуальныя або групавыя — з удзелам не больш як трох чалавек) на электронную пошту konkurs@ncpi.gov.by. Пры гэтым неабходна ўказаць назву работы, кантактную інфармацыю і ўзрост канкурсанта, а памер ліста не павінен быць больш за 10 Мб. Дарослыя могуць дапамагаць у стварэнні работы толькі ў якасці акцёраў відэароліка.

Падлеткам прапануецца стварыць прававыя відэалайфхакі на наступных тэмах: правы і абавязкі дзіцяці; сацыяльная абарона сям'і і дзяцей дзяржавай; правапарушэнні непаўналетніх і наступствы іх здзяйснення; абарона правоў дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў; правы дзяцей-інвалідаў; іншая тэматыка, якая датычыцца правоў, абавязкаў і адказнасці непаўналетніх.

Паняцце «лайфхак» у дадзеным выпадку азначае карысныя рашэнні, рэкамендацыі, разумныя парады і нават інструкцыі — як правільна, з карысцю і ў межах закона рэалізаваць свае правы і абавязкі. Удзельнікам прапаноўваецца расказаць у відэа, як зрабіць сваё жыццё лепш і быць больш культурным і адукаваным у прававых момантах. А таксама як больш прадукцыйна арганізоўваць вучобу і адпачынак, клапаціцца пра здароўе і эфектыўна выкарыстоўваць камп'ютарныя тэхналогіі, патлумачылі арганізатары.

Тэхнічныя патрабаванні да конкурснага файла: хронаметраж відэа — адна хвіліна, аптымальнае раздзяленне — 1080 Ч 1920 пікселяў, суадносіны бакоў — 9:16, памер — 100 Мб, фармат — MP4 або MOV.

Арганізатары абяцаюць, што ўзнагароджанне пераможцаў прызамі і дыпломамі адбудзецца 30 ліпеня — у Міжнародны дзень сяброўства.

Ірына СІДАРОК.

АНАТОМІЯ МЕЗАЛЬЯНСУ

Чаму няроўныя шлюбы былі, ёсць і будуць?

Саюз 43-гадовага прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона і 67-гадовай Брыжыт, 83-гадовага рэжысёра Андрона Канчалоўскага і 47-гадовай Юліі Высоцкай, спявачкі Алы Пугачовай і гумарыста Максіма Галкіна, малодшага за сваю жонку на 27 гадоў... Прыклад Эдуарда VIII, які адрокся ад трону, каб ажаніцца на разведзенай Уоліс Сімпсан... Гісторыя кахання простай афіцыянткі Наталлі Аліевай са Смалявічаў і наследнага прынца Дубая... Любая — узроставая, сацыяльная, адукацыйная, культурная, фінансавая — няроўнасць, вядома, ускладняе адносіны мужчыны і жанчыны. Дык чаму ж і тыя, і іншыя ўсё-ткі ідуць «на збліжэнне» і рашаюцца на сумеснае жыццё?

ЛЮБОЎ РАТУЕ АД «УЗРОСТУ»

На думку спецыялістаў, розніца ў 7—10 гадоў ужо стварае пэўныя складанасці паміж партнёрамі. Чым больш узроставы разрыў, тым больш адрозненняў, несупадзенняў, тым складаней іх пераадолець. І заўсёды вялікая спакуса ўгледзець у мезальянсах маладых дзяўчат і юнакоў са спелымі «папікамі» і «матулямі» выключна карыслівае імкненне — уладкавацца ў жыцці, палепшыць фінансавае становішча, падняцца па кар'ернай лесвіцы. Але не ўсё і не заўсёды так прымітыўна і проста.

— Дзяўчаты нярэдка выбіраюць сталых спадарожнікаў, каб адчуваць сябе пад абаронай, зведваць клопат і ўвагу, якіх не хапала ў дзяцінстве, — кажа **псіхолаг Алена ГУРЫНА.** — Часта яны раслі ў сем'ях, дзе не было бацькі ці ён не займаўся выхаваннем дачкі, выяўляў абыякавасць або залішнюю строгасць, патрабавальнасць. Стаўшы дарослымі, такія дзяўчаты імкнуцца кампенсаваць недахоп любові ў адносінах з мужам. Гатовых стаць апорай, песціць і клапаціцца пра жонку як пра маленькую дзяўчынку сярод аднагодкаў значна менш, чым сярод мужчын старэйшага пакалення.

За вядомай фразай «сівізна — у бараду, чорт — у рабрыну» ляжаць звычайна ўзроставыя крызісы 50—60-гадовых мужчын. Гэта час падвядзення вынікаў, і калі яны несуцяшальныя, ёсць незадаволенасць дасягнутым, то мужчыны імкнуцца «перазагрузіцца» ў новых адносінах. Яны часта сыходзяць ад жонак-аднагодак да маладзенькіх спадарожніц, спадзеючыся атрымаць новы імпульс для руху наперад. Жонкі, прыдатныя ў дочкі, падсілкоўваюць іх энергіяй, павышаюць самаацэнку і рэйтынг у вачах навакольных.

Ёсць і іншыя псіхалагічныя матывы няроўнага выбару. 35-гадовым мужчынам часам цяжка будаваць партнёрскія адносіны з паспяховымі равесніцамі, а побач з 20-гадовай дзяўчынай яны адчуваюць сябе больш дасведчанымі, спелымі, гэта падабаецца і ўсяляе ўпэўненасць у сабе.

Больш распаўсюджанымі сталі шлюбы сталых жанчын з маладымі мужчынамі. Здараецца, прывабныя альфонсы свядома выбіраюць у спадарожніцы «мамак», гатовых іх нават утрымліваць, абы не застацца ў адзіноце. Але зноў далёка не заўсёды адносіны гэтым вычэрпваюцца. Часам жанчына выбірае сабе маладога спадарожніка, «усынаўляе» яго з-за нерэалізаванага мацярынскага патэнцыялу, з-за таго, што дзеці выраслі, мужа і ўнукаў побач няма, а навыкаў і жадання жыць уласнымі інтарэсамі не сфарміравалася. Часам мужчына ініцыіруе адносіны, паколькі яму шчыра падабаецца спелая жанчына, а яна адгукаецца на праяўленне пачуццяў з яго боку, адчуваючы сябе жаданай і прывабнай, нягледзячы на ўзрост.

У сексуальным дачыненні няроўныя па ўзросце саюзы пры супадзенні пэўных перыядаў могуць быць цалкам гарманічнымі. Лібіда мужчыны бліжэй да 50 гадоў пачынае згасаць, у яго знікаецца патрэба ў колькасці палавых актаў, з'яўляецца большы кантроль. Ён гатовы павялічыць прэлюдыю, праяўляе больш ласкі, у чым і маюць патрэбу маладыя партнёркі. А 35—45-гадовыя жанчыны, знаходзячыся на піку сексуальнасці, могуць выдатна супадаць у сваіх патрэбах і магчымасцях з 25-летнімі партнёрамі.

Многія лічаць, што «няроўным» партнёрам варта не спяшацца з афіцыйным афармленнем адносін, а пажыць нейкі час разам, прыгледзецца адзін да аднаго, абмеркаваць свае чаканні і асцярогі.

— Але і рызык у рознаўзроставых саюзах дастаткова, — лічыць Алена Гурына. — Розны бэкграўнд (гульні, школьныя будні, студэнцкія традыцыі, кнігі, фільмы, музыка), на якім раслі і фарміраваліся прадстаўнікі розных пакаленняў, часта стварае непаразуменне паміж партнёрамі. Калі цытаты з фільма або кнігі знаходзяць водгук у спадарожніка, гэта вельмі збліжае. Праблемы ў такім шлюбе ўзнікаюць і з прычыны баўлення вольнага часу, адносін са сваякамі, сябрамі. Спелы чалавек не заўсёды захоча ісці на дыскатэку, гуляць у боўлінг, а больш ахвотна застанецца дома, аддасць перавагу вузкаму колу блізкіх людзей, а не шумнай кампаніі.

Маладыя «палавінкі», асабліва ў перыяд закаханасці, не заўсёды аддаюць сабе справаздачу ў тым, што ў недалёкай перспектыве ім, магчыма, прыйдзецца даглядаць хворага ці нямоглага спадарожніка. Як правіла, ім складана знайсці агульную мову з ужо дарослымі дзецьмі сваіх партнёраў ад ранейшых шлюбаў. Часта яны хочуць сваіх дзяцей, у той час як іх сталыя спадарожнікі — супраць. Гэта вельмі сур'ёзныя рознагалоссі. І калі не атрымаецца дасягнуць кампрамісу, то адносіны хутчэй за ўсё завершацца. Праўда, ёсць мужчыны, якія і ў 70 гадоў гатовы стаць бацькамі і іх не бянтэжыць, што ставіць на ногі дзіця іх маладым жонкам прыйдзецца, магчыма, у адзіночку.

— Нярэдка няроўныя шлюбы атручвае рэўнасць з боку спелых мужчын і жанчын, іх падазрэнні з прычыны здрады «моладзі», — працягвае Алена Гурына. — Жанчынам у такіх саюзах дадатковы стрэс ствараюць перажыванні і трывогі з-за знешнасці, якая выдае ўзрост, з-за рэакцыі навакольных на іх мезальянс. Дарэчы, паводле некаторых замежных даследаванняў, маладзейшыя партнёры ў няроўных па ўзросце шлюбах старэюць хутчэй, чым у роўных.

Рознаўзроставыя саюзы па-ранейшаму не ўсімі і не ўсюды прымаюцца. Але ў цэлым грамадства стала прыкметна лаяльнейшым да іх. Жанна Маро казала: «Узрост не абараняе ад кахання, але каханне ратуе ад узросту».

ВАЖНЕЙ ЗА ТЫТУЛЫ

Цяперашні кароль Іспаніі Філіп VI шчасліва жанаты на разведзенай журналістцы Лецісіі Орціс Ракасалана. Абодва мужы прынцэсы Манака Стэфаніі — не яе «кола»: першы быў целаахоўнікам, другі — цыркавым акрабатам. Ужо некалькі японскіх прынцэс не пабаяліся страціць тытулы, каб выйсці замуж па каханні за звычайных суграмадзян.

Калі ўжо манаршыя асобы могуць дазволіць сабе кіравацца пачуццямі, дык іншыя — тым больш. Базавыя патрэбы — у каханні, разуменні, удзеле — маюць у сучасным свеце велізарнае значэнне незалежна ад сацыяльнага і фінансавага становішча. Што рабіць, калі багатыя і знакамітыя часам не знаходзяць іх у прадстаўнікоў свайго саслоўя?

Дапусцім, мужчына найлепшыя маладыя гады аддаў, будуючы кар'еру і дабіваючыся фінансавага поспеху. І вось усё ў яго ёсць, акрамя кахання і разумення. Жонка разглядае яго выключна як «кашалёк» і зусім не цікавіцца, чым ён жыве, што яго хвалюе. Вядома, мужчына пачне шукаць цяпло і разуменне «на баку», і яго наўрад ці збянтэжыць, калі іх «прапануе» жанчына іншага сацыяльнага або фінансавага статусу.

— Адрозненні ў жыццёвым вопыце, перажываннях, менталітэце, звычках, поглядах на выхаванне дзяцей і г. д., безумоўна, перашкаджаюць дамагчыся ў адносінах гармоніі, — прызнае Алена Гурына. — Сям'я людзей высокага сацыяльнага становішча звычайна цяжка прымае прадстаўнікоў нізоў. А партнёрам, якія стаяць на больш нізкіх сацыяльных прыступках, нялёгка пераадолець прорву, якая падзяляе іх з выбраннікам. Ім патрабуецца прыкласці намаганні, каб расці, вучыцца, развівацца. Успомнім «Пігмаліён» Б. Шоу: як нялёгка было Элізе Дулітл асвоіць гаворку прадстаўнікоў вышэйшага грамадства, манеры і нормы паводзін.

«Няроўныя шлюбы могуць аказацца вельмі «роўнымі» і гарманічнымі ў псіхалагічным дачыненні, калі абодва партнёры бяруць і даюць адзін аднаму пароўну шчасця, радасці, упэўненасці, цяпла».

У нашых рэаліях шлюб жонкі-ўрача і мужа-вадзіцеля можа аказацца цалкам устойлівым, калі мужчына ганарыцца спадарожніцай, падтрымлівае яе, не раўнуе да прафесійных, кар'ерных поспехаў і сам развіваецца як асоба. Калі ж партнёр пасля заканчэння мядовага месяца пачне камплексаваць з прычыны інтэлектуальнай, адукацыйнай перавагі сваёй палавінкі, зневажаць жонку з-за гэтага, то адносіны альбо завершацца, альбо будуць прыносіць пакуты.

Па словах Алены Гурынай, у сваёй практыцы яна неаднойчы сустракала прыклады, калі «ўзорнапаказальныя» дзяўчаты з забяспечаных сем'яў выбіралі сабе ў спадарожнікі жыцця «двоечнікаўхуліганаў» з сацыяльна праблемных сем'яў. У аснове такіх гісторый, як правіла, — жаданне выратаваць «грэшніка», ашчаслівіць яго і чаканне ў адказ бязмежнай удзячнасці і кахання. Аднак перавыхаваць, перарабіць чалавека пад сваё «лекала», калі той сам гэтага не жадае, не атрымаецца. Гэта загадзя правальны план.

БЫЦЬ АБО НЕ БЫЦЬ?

— Узровень рэфлексіі і ўсвядомленасці ў любым шлюбе вельмі важны, — падкрэслівае Алена Гурына. — Для «няроўных» (па ўзросце, сацыяльным і фінансавым статусе, вераваызнанні) партнёраў вельмі важны матывы, па якіх яны выбіраюць адзін аднаго, разуменне будучых цяжкасцяў, гатоўнасць прыкладаць намаганні для іх пераадолення, здольнасць ісці на кампрамісы, дамаўляцца, чымсьці ахвяраваць. Калі людзям цікава разам, калі яны задавальняюць патрэбы адзін аднаго — у каханні, клопаце, матэрыяльным забеспячэнні, інтэлектуальным развіцці і г. д., — то шанцы захаваць адносіны ўзрастаюць.

Многія лічаць, што «няроўным» партнёрам варта не спяшацца з афіцыйным афармленнем адносін, а пажыць нейкі час разам, прыгледзецца адзін да аднаго, абмеркаваць свае чаканні і асцярогі. Гэта нядрэнная парада.

Але на памяць прыходзіць прыклад англійскай пісьменніцы Агаты Крысці. Калі 25-гадовы Макс Мэлаўн зрабіў ёй прапанову, яна вырашыла параіцца з сястрой: яе бянтэжыла 15-гадовая розніца ва ўзросце з жаніхом. Сястра парэкамендавала Агаце не спяшацца і праверыць пачуцці на сапраўднасць. Выслухаўшы, пісьменніца вырашыла... не адкладваць шлюб. «Разумееш, за тры гады я яшчэ больш састарэю. Жыццё праходзіць, і час ляціць вельмі хутка. Мабыць, я выйду замуж за Макса, пакуль ён прапануе. І наогул — ці мала што наперадзе...»

Рызыка памыліцца ёсць і ў партнёраў аднаго ўзросту, сацыяльнага становішча, фінансавага статусу. А няроўныя шлюбы могуць аказацца вельмі «роўнымі» і гарманічнымі ў псіхалагічным дачыненні, калі абодва партнёры бяруць і даюць адзін аднаму пароўну шчасця, радасці, упэўненасці, цяпла. Так што, калі гаворка датычыцца спраў сардэчных, самае дакладнае — слухаць сябе і сваё сэрца.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ.